ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГОД ВЫДАННЯ 32-гі № 31 (1772) | Аўторак, 16 красавіка 1963 года. | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА • УСЛАЎЛЯЦЬ ГЕРОЯЎ НАШЫХ ДЗЁН • МУЗЫЦЫ — ГЛЫБОКУЮ ДУМКУ І ПРЫГОЖУЮ МЕЛОДЫЮ • ПРАЦЯГ ДЫСКУСІІ АБ НАДЗЁННЫХ ПРАБЛЕМАХ ЛІТАРАТУРЫ • РЭПАРТАЖ З БРАГІНСКАГА НАРОДНАГА ТЭАТРА • З НАШАЙ ПОШТЫ

БУДЗЕМ СВЯТА ЗАХОЎВАЦЬ І РАЗВІВАЦЬ ЛЕНІНСКІЯ ПРЫНЦЫПЫ ПАРТЫЙНАСЦІ І НАРОДНАСЦІ МАСТАЦТВА

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

Мы, пасланцы многанацыянальнага калектыву савецкіх мастакоў, сабраліся на наш II Усесаюзны з'езд у знамянальны для нашай краіны час.

Савецкі народ, натхняемы роднай Камуністычнай партыяй, уступіў у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма. Расце і ўмацоўваецца эканоміка і культура ўсяго магутнага лагера сацыялізма.

Новая Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, выступленні таварыша М. С. Хрушчова па пытаннях літаратуры і мастацтва з'явіліся буйнейшым укладам у творчае развіццё ленінскіх метадаў кіраўніцтва мастацтвам, у развіццё марксісцка-ленінскай эстэтыкі. Яны дакладна вызначылі шляхі развіцця нашага мастацтва, яго ролю ў камуністычным будаўніцтве.

Мы горача ўдзячны ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту за высокую ацэнку савецкага выяўленчага мастацтва як магутнага сродку камуністычнага выхавання, за партыйную патрабавальнасць і вялікае давер'е савецкім мастакам, выказаныя ў прывітанні ЦК КПСС нашаму з'езду. Мы разглядаем прывітанне ЦК КПСС як канкрэтную, баявую праграму развіцця савецкага выяўленчага мастацтва.

Барацьба за камунізм ідзе ў абстаноўцы вострага ідэалагічнага змагання двух светаў. Гэта—барацьба свету сацыялізма, у якім ажыццёўлены спрадвечныя мары працоўнага чалавецтва аб свабодзе, роўнасці і шчасці, з асуджаным на пагібель светам капіталізму, светам жорсткасці і нянавісці, светам эксплуатацыі чалавека чалавекам.

Паміж ідэалогіямі гэтых дзвюх грамадскіх сістэм няма і не можа быць мірнага суіснавання. Мы заўсёды былі і будзем перакананымі барацьбітамі за мастацтва, якое актыўна і адкрыта змагаецца за сцвярджэнне вялікіх ідэй камунізма.

Выступаючы супраць любых праяў рэакцыйнай буржуазнай ідэалогіі, адстойваючы камуністычную накіраванасць і ідэйную чысціню нашага мастацтва, мы будзем актыўна падтрымліваць барацьбу прагрэсіўных мастацкіх сіл свету за мастацтва, якое ўсталёўвае ідэалы міру і дэмакратыі. Выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак, мы ў братняй садружнасці з мастакамі краін сацыялізма будуем адзіную па сваім ідэйным змесце, шматгранную па мастацкай форме вялікую культуру сацыялізма.

Мы бязмежна ўдзячны партыі, яе ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту на чале з Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым за прынцыповую, клапатлівую і суровую крытыку памылак, дапушчаных часткаю мастакоў і мастацтвазнаўцаў. Кіраўнікі партыі і ўрада заклікалі нас да рашучай барацьбы з уплывам буржуазнай ідэалогіі, да барацьбы за чысціню прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму, за сапраўднае наватарства ў савецкім мастацтве, якое сцвярджае прагрэсіўныя рэвалюцыйныя традыцыі мастацкай культуры.

Увесь шлях развіцця савецкага выяўленчага мастацтва наглядна сведчыць аб тым, што толькі метад сацыялістычнага рэалізму адкрывае прастору для сапраўды свабоднай творчасці, якое непарыўна звязана з жыццём народа, выказвае яго волю, пачуцці і думкі, заклікае на подзвігі ў імя камунізма. Наша мастацтва звернута да чалавека, яно імкнецца быць яго памочнікам і добрым дарадчыкам у барацьбе за камуністычныя ідэалы. Менавіта таму мы рашуча і пераканаўча выступаем супраць пачварнага, бесчалавечнага абстракцыянізму і фармалізму, менавіта таму нам варожыя натуралізм і рамесніцтва.

Развіццё па шляху сацыялістычнага рэалізму забяспечвае нашаму мастацтву сапраўдную разнастайнасць форм і жанраў, росквіт талентаў, свабоднае развіццё творчых індывідуальнасцей. Змагаючыся супраць антымастацкіх пачварнасцей фармалістычнага напрамку, мы ўсталёўваем сапраўдную разнастайнасць рэалістычнага мастацтва, разнастайнасць прыгожага.

Толькі мастацтва вялікіх рэвалюцыйных ідэй, высокага стваральнага пафасу і мастацкай дасканаласці здольна задаволіць эстэтычныя запатрабаванні народа, актыўна фарміраваць эстэтычную культуру чалавека камуністычнага грамадства.

Натхнёныя партыяй, мы, савецкія мастакі, прадстаўнікі ўсіх пакаленняў, адзіныя ў сваім імкненні ісці па накрэсленым партыяй шляху

Савецкія мастакі прыкладуць усе свае сілы, каб апраўдаць высокае давер'е партыі і народа. Мы глыбока ўсведамляем грамадзянскі абавязак савецкага мастака і яго адказнасць перад народам. Савецкія мастакі служаць адзінай справе будаўніцтва камунізма і стварэнню яго баявога рэвалюцыйнага мастацтва. На заклік партыі мы адкажам яшчэ больш шчыльнай згуртаванасцю ўсіх савецкіх мастакоў на пазіцыях камуністычнай партыйнасці, народнасці, на пазіцыях сацыялістычнага рэалізму. Мы накіруем усе свае творчыя сілы на развіццё мастацтва, якое памагае народу ў яго жыцці і барацьбе, мастацтва, якое натхнёна ўсталёўвае волічную прыгажосць таго новага, камуністычнага, што нараджаецца ў нашым жыцці.

Мы, дэлегаты II Усесаюзнага з'езда мастакоў, запэўняем Камуністычную партыю і яе Цэнтральны Камітэт у тым, што мы свята будзем захоўваць і развіваць вялікія ленінскія прынцыпы партыйнасці і народнасці мастацтва, прынцыпы сацыялістычнага рэалізму.

Шчаслівы савецкі мастак, які ўсведамляе, што ён творыць для свайго народа!

Шчаслівы і горды савецкі мастак, які ўсведамляе, што ён салдат партыі, што яго мастацтва, вернае ідэям Леніна, заўсёды з народам!

Няхай жыве савецкі народ—будаўнік камунізма!

Няхай жыве наша родная Камуністычная партыя!

ДРУГІ ЎСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД САВЕЦКІХ МАСТАКОЎ

НАРОДНЫЯ МАСТАКІ СССР

За вялікія заслугі ў развіцці савецкага выяўленчага мастацтва Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 12 красавіка 1963 года прысвоіў ганаровае званне народнага мастака СССР:

АБДУЛАЕВУ Мікаілу Гусейн аглы,
АНІКУШЫНУ Міхаілу Канстанцінавічу,
БЕЛАШОВАЙ Екацярыне Фёдараўне,
БАГДЗЕСКА Ілы Трафімавічу,
БОЖЫЮ Міхаілу Міхайлавічу,
БАКШАЮ Іосіфу Іосіфавічу,
ДАЙНЕКУ Аляксандру Аляксандравічу,
ДЗЕРЭГУСУ Міхаілу Гардзеевічу,
ДЖАПАРЫДЗЕ Учэ Малакіевічу,
ЖУКАВУ Мікалаю Мікалаевічу,
КІБАЛЬНІКАВУ Аляксандру Паўлавічу,
ЛЫСЕНКУ Міхаілу Рыгоравічу,
ОКАСУ Эвальду Карлавічу,
САРКСЯНУ Ара Мігранавічу,
СВЕМПУ Лео Сімонавічу,
ТАНСЫКБАЕВУ Урапу,
ФАВОРСКАМУ Уладзіміру Андрэевічу,
ЧУЙКОВУ Сямёну Афанасьевічу,
ЮРКУНАСУ Вітаўтасу Мікалу.

Пра бясстрашных пакарыцеляў космасу

Рэспубліканскі Тэатр юнага гледача БССР днямі паказаў прэм'еру спектакля «Бітва ў космасе» па п'есе Міколы Гамолкі.

Спектакль паставіў галоўны рэжысёр тэатра Б. Дакутовіч. Мастак А. Тарасаў, кампазітар Я. Глебаў.

Галоўныя ролі выконвалі артысты П. Дубашынскі, В. Говар-Бандарэнка, А. Каляда, Г. Ручымскі, М. Пятроў, Р. Маленчанка.

БЕЛТА.

Падведзены вынікі форума мастакоў

Тры дні працягваўся ў Маскве II Усесаюзны з'езд мастакоў. Ён стаў выдатнай падзеяй у гісторыі савецкага выяўленчага мастацтва.

Творчая дыскусія на з'ездзе ішла па пытаннях, узнятых у дакладзе сакратара праўлення Саюза мастакоў СССР Е. Белашовай, і датычылася галоўным чынам прагрэмных задач, пастаўленых перад работнікамі мастацтва на сустрэчах кіраўнікоў партыі і ўрада з мастацкай інтэлігенцыяй. Палымяны заклік—тварыць для народа, у імя народа, выказаны ў прывітанні Цэнтральнага Камітэта КПСС з'езду, — знайшоў гарачы водгук у выступленнях дэлегатаў з'езда.

— Вытокі наватарства, — сказаў ленінградскі скульптар, лаўрэат Ленінскай прэміі М. Анікушын,—трэба шукаць у самім жыцці. Каб стаць сапраўдным наватарам, мастак павінен разгледзець яшчэ нікім не заўважанае, убачыць з'явы, якія належаць будучыні.

Пра няправільна зразуметае наватарства, якое па сутнасці з'яўляецца неадагматызмам, гаварыў старшыня праўлення Саюза мастакоў Украіны В. Касіян. Абстракцыянізму, гэтай касмапалітычнай па сваёй сутнасці плыні, няма месца ў савецкім мастацтве, заявіў ён.

Эстэтычнаму выхаваўчаму значэнню архітэктуры прысвяціў сваё выступленне сакратар праўлення Саюза архітэктараў СССР В. Бутузаў. Найвышэйшае шчасце для кожнага сапраўднага мастака — быць памочнікам партыі, працаваць для народа, для ажыццяўлення мары чалавецтва — камунізма. Пра гэта гаварылі прадстаўнікі: Літвы—І. Кузмінскіс, Латвіі—Э. Калнынь, Кіргізіі—Г. Айціеў, Эстоніі—Я. Енсен, Казахстана—Г. Ісмаілава, Узбекістана—І. Ікрамаў, Беларусі — П. Нікіфараў.

— Вострая партыйная крытыка шкодных памылак, сур'ёзных ідэйна-творчых хібаў некаторых мастакоў і мастацтвазнаўцаў, якая прагучала на сустрэчах кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва,—сказаў П. Нікіфараў,— мабілізуе нас, з'яўляецца сапраўднай школай ленінізма. Трэба сабраць сілы нашых тэарэтыкаў, крытыкаў, памагчы ідэйнаму і прафесіянальнаму росту мастацтвазнаўчых сіл на месцах. У Беларусі крытычная секцыя ў Саюзе мастакоў павялічылася, але ўзровень яе працы вельмі невысокі. Патрэбна дапамога праўлення саюза, цэнтральных творчых і навуковых арганізацый, каб усюды рашуча палепшыць тэарэтычную і крытычную работу.

Далей прамоўца гаворыць пра тое, што сувязі паміж усімі рэспубліканскімі саюзамі павінны быць яшчэ больш цеснымі. У Маскве паспяхова прайшла выстаўка работ беларускага мастака В. Цвіркі. А ў нас, працягвае прамоўца, не адзін Цвірка, у нас многа добрых мастакоў, з творчасцю якіх трэба пазнаёміць масквічоў і жыхароў іншых гарадоў.

П. Нікіфараў спыняецца на пытанні падрыхтоўкі кадраў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце і мастацкім вучылішчы, дзе былі факты, калі выпускнікі гэтых навучальных устаноў мелі вельмі слабае разуменне прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму. Трэба, каб адказнасць за падрыхтоўку мастакоў была ўскладзена на лепшых нашых майстроў і каб традыцыі ўвасабляліся не толькі ў даследаваннях, а і ў жывых людзях, у творчасці наступнага пакалення мастакоў.

У спрэчках удзельнічалі таксама правадзейныя члены Акадэміі мастацтваў СССР Б. Іягансон, В. Кеменаў, Е. Маісеенка (Ленінград), віцэ-прэзідэнт Акадэміі мастацтваў СССР М. Манізер, Н. Абдурахманаў (Азербайджан), Х. Хушвахтаў (Таджыкістан), А. Пластаў (Масква) і іншыя.

З'езд закончыў работу. Выбраны кіруючыя органы Саюза мастакоў СССР.

На заключным пасяджэнні дэлегаты з вялікім уздымам прынялі пісьмо ў адрас Цэнтральнага Камітэта КПСС.

13 красавіка адбыўся пленум новага праўлення Саюза мастакоў СССР. На пленуме быў выбраны сакратарыят праўлення ў складзе 23 чалавек. Першым сакратаром удзельнікі пленума адзінадушна выбралі народнага мастака СССР С. Герасімава.

Сакратарамі праўлення Саюза мастакоў выбраны: М. Анікушын (Ленінград), Н. Абдурахманаў (Азербайджан), Г. Айціеў (Кіргізія), Е. Белашова (Масква), І. Багдэска (Малдавія), В. Барадай (Украіна), М. Вітолінь (Латвія), У. Джапарыдзе (Грузія), Я. Енсен (Эстонія), І. Ікрамаў (Узбекістан), В. Касіян (Украіна), І. Клычоў (Туркменія), І. Кузмінскіс (Літва), П. Лебедзеў (Масква), А. Лапухоў (Украіна), Р. Парсамян (Арменія), К. Раждзественскі (Масква), В. Сяроў (Масква), Д. Суслаў (Маскоўская вобласць), К. Тэльжанаў (Казахстан), Х. Хушвахтаў (Таджыкістан), В. Цвірка (Беларусь).

Старшынёй Цэнтральнай рэвізійнай камісіі Саюза мастакоў СССР выбраны І. Цітоў (Масква).

У той жа дзень 13 красавіка праўленне Саюза мастакоў СССР, выбранае на II Усесаюзным з'ездзе, наладзіла ў Георгіеўскай зале Крамля прыём у сувязі з заканчэннем работы з'езда. У госці да мастакоў прыйшлі Л. І. Брэжнеў, А. П. Кірыленка, А. М. Касыгін, А. І. Мікаян, Д. С. Палянскі, М. А. Суслаў, П. Н. Дзямічаў, Л. Ф. Ільічоў, В. І. Палякоў, Б. М. Панамароў, А. М. Шаленін.

Верныя прынцыпам сацыялістычнага рэалізму, савецкія мастакі падагулілі вынікі вялікай работы, абмеркавалі дасягненні і недахопы ў сваёй дзейнасці—так рэзюміраваў работу форума майстроў выяўленчага мастацтва прэзідэнт Акадэміі мастацтваў СССР В. Сяроў, які выступіў на прыёме. Ён абвясціў здравіцу за вялікую Камуністычную партыю, за ленінскі Цэнтральны Камітэт, за непахіснага ленінца, лепшага друга савецкіх мастакоў Мікіту Сяргеевіча Хрушчова.

Ад Цэнтральнага Камітэта партыі і Савецкага ўрада мастакоў вітаў сакратар ЦК КПСС Л. Ф. Ільічоў.

Прыём прайшоў у абстаноўцы выключнай сардэчнасці.

СПРАВАЗДАЧЫ РОБЯЦЬ: ПІСЬМЕННІКІ, МАСТАКІ, АРТЫСТЫ

СУСТРЭЧА З ГЕРОЯМІ КНІГІ

Гэта сустрэча была не зусім звычайная. На яе прыйшоў не толькі аўтар твора «Руіны страляюць ва ўпор» Іван Новікаў, але і героі гэтай кнігі — Л. Ларына і Х. Прусліна. Яны прыйшлі ў бібліятэку Мінскага завода аўтаматычных ліній, каб разам з чытачамі абмеркаваць кнігу, выслухаць заўвагі чытачоў.

Уступнае слова сказаў начальнік пятага механічнага цэха В. Кебіч. Ён спыніўся на асобных вобразах твора.

Майстар механічнага цэха Я. Розін адзначыў, што кніга вельмі патрэбная і мае выхаваўчае значэнне для моладзі. Але некаторыя падзеі ў творы, на жаль, слаба паказаны. З думкай Я. Розіна пагадзіўся і начальнік першага механічнага цэха Л. Кокін.

Сваімі ўспамінамі падзяліліся з чытачамі героі кнігі Л. Ларына і Х. Прусліна. Яны расказвалі аб барацьбе з гітлераўскімі акупантамі.

У заключэнне выступіў Іван Новікаў.

У САЛДАЦКІМ КЛУБЕ

У Брэсце — вялікі атрад пачынаючых празаікаў і паэтаў. Многія з іх — В. Глебаў, В. Сухарукаў, А. Гарай, Ю. Пятроў і іншыя — часта друкуюць вершы і апавяданні, наладжваюць літаратурныя вечары і сустрэчы.

Асабліва ажывілася работа творчай моладзі ў гэтыя дні. Празаікі і паэты наладзілі некалькі вечароў. Адзін з іх адбыўся ў воінаў Брэсцкага гарнізона. Пра бацькоўскія клопаты Камуністычнай партыі аб развіцці савецкай літаратуры і мастацтва расказаў салдатам і афіцэрам пісьменнік А. Авечкін. Затым свае новыя творы прачыталі Д. Васілеўскі, А. Гарай. Прынялі ўдзел у гэтай сустрэчы і работнікі мастацтва. Галоўны рэжысёр Тэатра імя ЛКСМБ П. Вінаградаў расказаў аб новых пастаноўках, а скульптар А. Шмакаў—пра творы, прысвечаныя нашаму сучаснику.

Пачынаючыя пісьменнікі абмеркавалі задачы, якія стаяць перад імі па глыбейшаму вывучэнню жыцця. З дакладам выступіў пісьменнік Ул. Калеснік.

Празаікі і паэты Брэста запланавалі выезд на Бярозаўскую ДРЭС, а таксама некалькі літаратурных вечароў на прадпрыемствах Брэста.

ГРАМАДСКІ АДДЗЕЛ САТЫРЫ І ГУМАРУ

Пачынаючыя празаікі і паэты з літаратурнага аб'яднання пры бабруйскай газеце «Камуніст» пішуць творы, прысвечаныя героям сямігодкі.

Члены літаб'яднання стварылі пры газеце новы аддзел—сатыры і гумару. Аддзел працуе на грамадскіх асновах. Нядаўна была апублікавана першая сатырычная старонка. У ёй пачынаючыя пісьменнікі А. Гарэлік, І. Пірожнікаў, М. Бярэзінскі, С. Аляхновіч выкрывалі недахопы, крытыкавалі парушальнікаў грамадскага парадку.

Маладыя паэты падрыхтавалі новую сатырычную старонку.

ХРОНІКА

△ Скульптар З. Азгур пабываў у студэнтаў Белдзяржуніверсітэта імя Ул. І. Леніна. Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі ад памятных сустрэч кіраўнікоў партыі і ўрада а дзеячамі літаратуры і мастацтва.

△ Пра сучаснае выяўленчае мастацтва і творчасць беларускіх мастакоў расказаў воінам Н-скай часці мастак М. Гуціеў.

△ У сталічным клубе імя Дзяржынскага сабраліся настаўнікі Мінскага сельскага раёна. Яны з цікавасцю праслухалі даклад І. Шамякіна аб развіцці савецкай літаратуры. Свае новыя вершы прачыталі В. Вітка і М. Хведаровіч.

△ Жыццё савецкага чалавека — асноўная тэма перасоўнай выстаўкі, пасланай нядаўна ў Гродна Дзяржаўным мастацкім музеем рэспублікі. На выстаўцы — каля 60 работ. Сярод іх — творы мастакоў В. Бяльніцкага-Бірулі, В. Цвіркі, В. Жоўтак і іншых.

△ Віцебск наведалі беларускія пісьменнікі Алесь Асіпенка, Рыгор Барадулін, Сяргей Грахоўскі, Мікола Аўрамчык. Яны прынялі ўдзел у канферэнцыі чытачоў па часопісу «Маладосць», арганізаванай абласной бібліятэкай імя Ул. І. Леніна.

НА МІНСКІМ АЎТАМАБІЛЬНЫМ

Адзін з абедзенных перапынкаў у рабочых Мінскага аўтазавода быў незвычайны. У пакоях адпачынку іграла музыка, чуваць былі песні, гучалі вершы беларускіх паэтаў. Гэта ў госці да герояў сваіх будучых твораў прыйшлі пісьменнікі, мастакі, кампазітары, артысты, работнікі кінематаграфіі рэспублікі.

Вось навальскі цэх. Ён адзін з перадавых на заводзе: тут працуе 11 брыгад камуністычнай працы. Як толькі пачаўся абедзенны перапынак, рабочыя цэха адразу сабраліся ў пакоі адпачынку. Яны сардэчна і цёпла віталі сваіх гасцей — артыстаў Тэатра імя Я. Купалы Г. Глебава, Ул. Дзядзюшку, В. Пола, Л. Рахленку, Л. Давідовіча, В. Тарасава, Е. Кавалёву. Народны артыст БССР Л. Рахленка расказаў рабочым пра развіццё беларускага тэатральнага мастацтва, пра работу купалаўцаў над творамі класічнай і сучаснай драматургіі. Ён гаварыў, што выезды майстроў тэатра на заводы, у калгасы і воінскія часці—неад'емная частка іх працы. Затым былі паказаны сцэны са спектакля «Дзень цудоўных падманаў». Рабочыя шчыра дзякавалі гасцям.

Людна было ў інструментальным цэху. Тут выступалі пісьменнікі П. Пестрак, М. Ткачоў, М. Аўрамчык, А. Бялевіч, П. Прыходзька. Яны гаварылі пра сучасную літаратуру, пра новыя раманы, аповесці, вершы, пра вялікую ўвагу партыі да развіцця савецкай літаратуры і мастацтва, чыталі свае творы і адказвалі на пытанні. Ад імя рабочых сакратар партарганізацыі цэха А. Ермаловіч, дзякуючы пісьменнікам за прыезд і выступленні, выказаў пажаданне прысутных, каб такія сустрэчы былі часцей.

Цёплы прыём быў аказаны літаратарам у цэхах спецлічыння, тэрмічным, кабіна-кузаўным. Тут чыталі свае творы М. Калачынскі, П. Кавалёў, А. Кучар, С. Шушкевіч, Х. Мальцінскі, А. Алешка, М. Скрыпка, Г. Бураўкін, Э. Валасевіч, А. Дзерунмынскі.

У іншых цэхах ішла гаворка пра мастацтва, кіно, музыку. Мастакі М. Бельскі, М. Гугель, Б. Забораў, А. Кашкурэвіч, Г. Мурамцаў, Ю. Пучынскі, Л. Эдэльман наведалі рабочых дрэваапрацоўчага цэха. Аб апошніх падзеях у мастацтве і літаратуры расказаў рабочым А. Гугель.

Музычныя мелодыі чуліся з цэхаў — зборачнага і нармалей. Тут сустракаліся з аўтамабілебудаўнікамі кампазітары М. Аладаў, Р. Бутвілоўскі, Ю. Семяняка, музыказнаўца І. Нісневіч, Артысты В. Чарнабаеў, А. Волкава, А. Астрамецкі, Л. Гарэлік, Я. Лосеў, Ул. Болатаў, Г. Агніўцава і іншыя выканалі творы савецкіх кампазітараў.

Рэжысёр В. Пацехін, артысты Ул. Драбышэўскі, В. Козьмер з Тэатра юнага гледача наведалі рабочых прэсавага цэха, а работнікі кінастудыі «Беларусфільм» — сталеліцейшчыкаў. Рабочыя цэха шасі горача сустрэлі кампазітара Ул. Алоўнікава. Сустрэча дзеячоў літаратуры і мастацтва з рабочымі завода была цікавай і ўсхваляванай.

За заслугі ў развіцці беларускага выяўленчага мастацтва Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР прысвоены ганаровыя званні: народнага мастака Беларускай ССР — скульптару С. І. Селіханаву і галоўнаму мастаку Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета Я. Р. Чамадураву; заслужанага дзеяча мастацтва Беларускай ССР—мастакам К. М. Касмачову, А. А. Паслядовіч і А. Д. Шыбнёву.

Народны артыст СССР Г. Глебаў сярод рабочых навальскага цэха пасля выступлення.

Фота Ул. КРУКА.

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

Сяргей Іванавіч Селіханаў — адзін з вядомых у рэспубліцы скульптараў. У 1937 годзе ён скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча. З 1940 года актыўна ўдзельнічае ў мастацкіх выстаўках. Працуючы ў галіне партрэта, манументальнай і сюжэтна - кампазіцыйнай скульптуры, С. Селіханаў стварыў рад вобразаў нашых сучаснікаў, герояў вытворчасці і калгасных палёў, дзеячоў культуры.

Гледачы добра ведаюць і такія яго работы, як партрэты Салтыкова-Шчадрына і Якуба Коласа, кітайская серыя скульптурных партрэтаў і кампазіцый. Мастак удзельнічаў у рабоце над радам помнікаў і манументальных скульптур, якія ўпрыгожваюць гарады рэспублікі.

Імя Яўгена Рыгоравіча Чамадурава добра вядома аматарам тэатральнага мастацтва. Адзін з таленавітых тэатральных мастакоў, творчасць якога адрозніваецца высокім прафесіяналізмам, добрым густам, вастрынёй і арыгінальнасцю вырашэнняў, Яўген Рыгоравіч сумяшчае ў сабе здольнасці жывапісца, рэжысёра і музыканта.

Скончыўшы ў 1939 годзе Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры Усерасійскай Акадэміі мастацтваў, Я. Чамадураў працаваў у розных тэатрах краіны, а апошнія гады—у Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета. Тут ім афармлены спектаклі «Дон-Кіхот», «Мара», «Казка аб мёртвай царэўне і сямі волатах», «Пікавая дама», «Святло і цені» і іншыя.

У кожнага мастака ёсць свая любімая тэма. Для Канстанціна Міхайлавіча Касмачова, аднаго са старэйшых беларускіх жывапісцаў, гэта — рэвалюцыйнае мінулае нашай партыі і ў першую чаргу вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна. Пачынаючы з 1934 года, калі ён пачаў удзельнічаць у мастацкіх выстаўках, Канстанцін Міхайлавіч зноў і зноў звяртаецца да тэмы Ільіча. Няўхільна расце і мужнее талент гэтага своеасаблівага мастака. Развіваючы лепшыя традыцыі рускага класічнага жывапісу, ён шукае новыя сродкі вырашэння вялікіх і значных тэм. Аб гэтым сведчаць хоць бы апошнія яго работы — карціны «Напярэдадні», «Зара» і вялікі трыпціх «Незабыўнае» — гэтая своеасаблівая ленініяна К. Касмачова.

Уменне па-свойму свежа і цікава ўвасабляць у сваіх графічных лістах, пастэлях, акварэлях, ліграваюрах вобразы герояў нашых дзён, пейзажы роднай Беларусі вызначае творчасць таленавітага беларускага графіка Аляксандры Ануфрыеўны Паслядовіч. Яна добра вядомая і як удумлівы ілюстратар кніг. Творам А. Паслядовіч заўсёды ўласцівыя прыгажосць формы, паэтычнасць, лірызм. Мастачка вельмі добра адчувае матэрыял, умее выкарыстаць яго асаблівасці, падпарадкоўваючы пластычным і кампазіцыйным вырашэнням. Адчуваецца добрая школа, атрыманая мастачкай у час вучобы ў Інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Рэпіна Акадэміі мастацтваў СССР, які А. Паслядовіч скончыла ў 1950 годзе.

Вучань І. Бродскага і В. Сярова — Анатоль Дзям'янавіч Шыбнёў добра вядомы гледачам як жывапісец, у творчасці якога знаходзяць адлюстраванне самыя разнастайныя тэмы нашай сучаснасці. Яго карціны на гісторыка-рэвалюцыйныя тэмы — «Есць такая партыя», «Першы Усебеларускі з'езд Саветаў», «У Кастрычніку 1917 года», яго работы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне (напрыклад, «Палонных вядуць»), шматлікія пейзажы, якія ўслаўляюць прыгажосць беларускай прыроды, сведчаць аб эпічнасці творчага мыслення мастака.

Пачынаючы з 1934 года (пасля сканчэння Адэскага мастацкага інстытута), А. Шыбнёў актыўна удзельнічае амаль ва ўсіх рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках.

УСЛАЎЛЯЦЬ ГЕРОЯЎ НАШЫХ ДЗЁН

А. КОРНЕЎ,
сакратар Гомельскага прамысловага абкома КПБ.

Партыя, савецкі народ бачаць у нашай літаратуры і мастацтве магутны сродак выхавання працоўных у духу камуністычных ідэалаў. Агульнавядомыя поспехі савецкай літаратуры і мастацтва ў адлюстраванні нашай рэчаіснасці, у высокамастацкім паказе велічных спраў і багатага духоўнага свету савецкага чалавека.

Шырока папулярная ў народзе творчасць Максіма Горкага і Уладзіміра Маякоўскага, Дзям'яна Беднага і Дзмітрыя Фурманава, Аляксея Талстога і Аляксандра Серафімовіча, Аляксандра Фадзеева і Мікалая Астроўскага, Якуба Коласа і Янкі Купалы. Прыкладам высокага разумення задач мастака з'яўляецца творчасць М. Шолахава, А. Твардоўскага, Л. Ляонава, П. Броўкі, М. Рыльскага, К. Сіманава і іншых мастакоў слова.

Аднак, як сказаў на нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі таварыш М. С. Хрушчоў, было б шкодным не заўважаць сур'ёзных недахопаў у рабоце літаратараў, мастакоў, кампазітараў, дзеячоў кіно і тэатра. Ца гэтай сустрэчы ў Крамлі, а таксама на пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў СССР і ў нашым друку былі падвергнуты справядлівай крытыцы нездаровыя з'явы ў творчасці некаторых маладых пісьменнікаў, у прыватнасці Я. Еўтушэнкі, А. Вазнясенскага, В. Аксёнава, кінарэжысёра М. Хуцыева і іншых.

Кожнага савецкага чалавека да глыбіні душы абурыла «Аўтабіяграфія» Я. Еўтушэнкі, апублікаваная ў французскім рэакцыйным часопісе «Экспрэс». Блытаныя і непрадуманыя фармуліроўкі, палітычная нясталасць, жаданне «пакрасавацца» і выдаць сябе за наваяўленага генія, — вось чым прасякнута гэтая яго пісаніна. Міжволі прыходзіць на ўспаміны трапная прымаўка: «А кароль, аказваецца, быў голы».

Шчырая, няхай сабе і рэзкая крытыка нездаровых з'яў у творчасці маладых пісьменнікаў і мастакоў выклікана вялікай заклапочанасцю партыі будучыняй нашай літаратуры і мастацтва. Побач з майстрамі старэйшага пакалення моладзь заклікана ствараць культуру камуністычнага грамадства. Таму такія вялікія клопаты партыі аб выхаванні ў маладых талентаў правільнага светапогляду, павагі да вялікіх традыцый рускага і савецкага мастацтва.

У літаратуру нашу за апошнія гады прыйшло многа здольных маладых пісьменнікаў і паэтаў, якія знайшлі ці знаходзяць свае тэмы, свой падыход да з'яў жыцця.

Здольная моладзь прыходзіць і ў беларускую літаратуру. Пэўным пацвярджэннем гэтага можа служыць і Гомельскае абласное літаратурнае аб'яднанне. У літаб'яднанні налічваецца каля 30 аўтараў. Гэта — людзі розных прафесій, рознага жыццёвага ўзроўню. У меру сваіх сіл і магчымасцей кожны з іх імкнецца ўнесці свой пасільны ўклад у літаратуру.

Міхась Даніленка сёлета выдае сваю пятую кнігу. Старшы кансультант абласнога суда А. Капусцін выдаў кнігу апавяданняў «Суд ідзе». Нядаўна Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла кнігу вершаў для дзяцей настаўніка з Веткаўшчыны Станіслава Кацубы. Рыхтуюцца да друку кнігі работнікаў студыі тэлебачання Яўгена Каршукова і Леаніда Гаўрылкіна, а таксама дацэнта Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту Мікалая Праўдзіна. На старонках рэспубліканскага друку можна часта бачыць вершы Міколы Кусянкова, Анатоля Грачанікава, Вадзіма Зыблева.

Удзельнікі літаратурнага аб'яднання прымаюць актыўны ўдзел у традыцыйных «Тыдні ваеннай кнігі» і «Тыдні дзіцячай кнігі», часта выступаюць з чытаннем сваіх твораў перад працоўнымі вобласці, школьнікамі.

Маладыя аўтары імкнуцца глыбей вывучаць жыццё, не замыкацца ў чатырох сценах рэдакцыйных ці іншых службовых кабінетаў. Язэп Куралікаў пэўны час працаваў рэдактарам абласной студыі тэлебачання. Аўтару хацелася вывучыць працу і быт лесарубаў, і ён, не пабаяўшыся цяжкасцей, пайшоў працаваць лесарубам на Буда-Кашалёўскі лесаўчастак.

Аднак у рабоце літаратараў не ўсё яшчэ добра. У літаб'яднанні рэдка праводзяцца цікавыя творчыя дыскусіі, не прымаюцца дзейсныя захады да павышэння пісьменніцкага майстэрства. А хіба гэта нармальна, што абласная газета вельмі ж неахвотна аддае свае старонкі для твораў пачынаючых? У мінулым годзе «Гомельская праўда» змясціла толькі адну «Літаратурную старонку». Усяго адна такая старонка была надрукавана і сёлета.

Пры Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна таксама ёсць літаратурнае аб'яднанне. Але замест прынцыповага, дзелавога разбору твораў пачынаючых тут часта пануе напышлівае славаслоўе, захвальванне слабых твораў. Васьмікласнік адной з гомельскіх школ Яўген Глушакоў, напрыклад, напісаў верш «Паркалёвая Венера». Замест таго, каб параіць яму вучыцца, кіраўнікі літаб'яднання пачалі ўсяляк захвальваць Я. Глушакова, хоць названы верш яго меў значныя ідэйна-мастацкія хібы.

Працуе ў Гомелі і даволі вялікі па колькасці атрад мастакоў. Рад іх работ атрымаў станоўчую ацэнку грамадскасці на абласной, рэспубліканскай і ўсесаюзнай выстаўках.

Адным з актыўнейшых жывапісцаў Гомеля з'яўляецца мастак В. Казакевіч. Летась на рэспубліканскай выстаўцы былі дзве яго работы — «Вялікая вада» і «Вясновы дзень». Старэйшы пейзажыст рэспублікі Б. Звінагродскі і мастак В. Казачэнка неаднаразова ўдзельнічалі ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках. Заслужаны дзеяч мастацтва БССР Б. Звінагродскі ўжо многа гадоў на грамадскіх асновах выкладае жывапіс ва універсітэце мастацкага выхавання пры Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна, з'яўляецца дэканам факультэта выяўленчага мастацтва, членам Савета універсітэта.

Значныя поспехі ёсць у маладых мастакоў Любові і Яўгена Пакаташкіных. Іх таленавітыя работы «Памром, але не здадзімся», «У атаку» дэманстраваліся на Усесаюзнай мастацкай выстаўцы і набыты Дзяржаўным мастацкім музеем БССР. Прыцягваюць увагу сваёй шчырасцю і майстэрствам творы мастака Барыса Кузьмічова «Мацней за смерць», «Ленін. Апасіянната», «Зімовы пейзаж», якія экспанаваліся на другой Усесаюзнай выстаўцы эстампа ў Кіеве і Маскве.

І ўсё ж, калі гаварыць шчыра, мастакі Гомеля ў вялікім даўгу перад партыяй і народам. Яны яшчэ мала стварылі хвалюючых карцін, якія б адлюстроўвалі героіку сённяшняга дня. Многія карціны напісаны на нізкім прафесіянальным узроўні. У мінулым годзе ў Гомелі была арганізавана выстаўка работ мясцовых мастакоў. Але яна мала прыцягнула да сябе наведвальнікаў, бо была надзвычай бедная. Мастакі Міхаіл Шкрабаў, Аляксандр Каламійцаў, Леў Рохман, Мікалай Мазураў выставілі вельмі слабыя работы. А. Каламійцаў, М. Мазураў, А. Ганчароў ніколі не экспанавалі сваіх работ на рэспубліканскіх выстаўках. Л. Рохман паспрабаваў прапанаваць на выстаўку свае эцюды, але ніводзін з іх не быў прыняты выстаўкомам. Не адчуваецца творчага росту ў мастакоў Г. Мілкова, Ул. Рыкаліна, М. Гаранскага, А. Іваноўскага, Г. і А. Осіпавых.

У эстэтычным выхаванні нашага народа, у фарміраванні высокага мастацкага густу вялікую ролю адыгрывае тэатр. Неабходна адзначыць, што працоўныя Гомельшчыны любяць свой тэатр. Даволі сказаць, што за мінулы год на яго спектаклях пабывала больш 350 тысяч чалавек. У тэатры былі падрыхтаваны і паказаны многія цікавыя рэчы. Аднак уключэнне ў рэпертуар сёлетняга тэатральнага сезона п'есы італьянскага драматурга Калегары «Апаленыя жыццём» трэба лічыць памылкай тэатра. Патрэбна больш адказна, больш удумліва ставіцца да рэпертуару. Гэтаму памогуць і больш цесная сувязь тэатра з гледачом, веданне яго патрэб, уважлівае рэагаванне на яго заўвагі.

Хочацца некалькі заўваг зрабіць аб рабоце абласной студыі тэлебачання. Тут было падрыхтавана нямала цікавых, змястоўных перадач, якія парадавалі гледачоў. Удалыя часопісы «Справы маладзёжныя» і «Для вас, жанчыны». Рэдакцыі тэлестудыі імкнуцца выхоўваць сваіх гледачоў, асабліва моладзь, на прыкладах гераізму нашых землякоў у гады Вялікай Айчыннай вайны, працоўнага энтузіязму сённяшніх будаўнікоў камунізма.

Гэта, аднак, не значыць, што ў рабоце студыі тэлебачання ўсё гладка. Ёсць яшчэ нямала прыкрых хібаў, памылак і недахопаў, якія адмоўна адбіваюцца на якасці і мастацкім узроўні перадач. Усё яшчэ мала перадач, прысвечаных людзям працы, перадавікам вытворчасці, а калі яны і бываюць, дык, на жаль, робяцца схематычна, нецікава, бледна. Хіба нельга, напрыклад, падрыхтаваць цікавую тэлевізійную перадачу, прысвечаную аднаму дню жыцця такога буйнага прадпрыемства, як «Гомсельмаш»? Затое студыя часта «частуе» гледачоў абылкава падрыхтаванымі перадачамі. Слабай і безмястоўнай была, напрыклад, пастаноўка па аповесці І. Палухіна «Вір».

Лепшай павінна быць рэжысёрская работа тэлевізійных перадач, багацейшай і ярчэйшай іх мова.

У бітве за камунізм, у барацьбе за фарміраванне новага чалавека — будаўніка камунізма вастрыё ідэалагічнай работы павінна быць накіравана супраць перажыткаў мінулага ў свядомасці людзей, супраць разлагаючага ўплыву буржуазнай ідэалогіі. Наша партыя заўсёды выступала за партыйнасць літаратуры і мастацтва. Яна лічыла і лічыць літаратуру і мастацтва сваёй вострай ідэйнай зброяй і нікому не дазволіць прытуляць яе. Аб гэтым павінны памятаць работнікі літаратуры і мастацтва. Яны — памочнікі партыі ў камуністычным выхаванні працоўных. Гэта — высокая, ганаровая і адказная задача, і яна абавязвае да многага.



«Апошні снег», «Зімовы пейзаж», «Пейзаж Гомельшчыны» — работы гомельскага мастака В. Краўцова. Яны экспанаваліся на рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках. Цяпер мастака захапіла жыццё працаўнікоў вёскі. Ён плённа працуе над нарцінай, якой даў назву «На саўгасным двары».
Фота Ул. КРУКА.

У мінулую суботу гасцінна расчыніліся дзверы новай канцэртнай залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Гэта — выдатны падарунак нашых архітэктараў і будаўнікоў аматарам музычнага мастацтва.

Міністр культуры БССР Р. Кісялёў, адкрываючы Палац музыкі, шчыра, ад усяго сэрца вітаў прысутных з гэтай вялікай падзеяй у культурным жыцці мінчан.

У новай канцэртнай зале адбыўся першы музычны вечар з разнастайнай праграмай. Дзяржаўны сімфанічны аркестр і Акадэмічная харавая капэла БССР выканалі пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора філармоніі В. Катаева Дзевятую сімфонію Бетховена. У другім аддзяленні выступілі Дзяржаўны народны хор БССР і вядучыя салісты опернага тэатра і філармоніі.

На здымку: у новай канцэртнай зале.

БЕЗ КАМПРАМІСАЎ!

Д. ЛУКАС,
кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтва БССР

У ЧАС неаднаразовых зарубежных паездак мне даводзілася шмат чуць розных твораў, у тым ліку дадэкафоннай, канкрэтнай, электроннай музыкі. Яе аўтары пішуць свае «шэдэўры» для абмежаванага кола слухачоў — тлустых буржуа, прадстаўнікоў «залатой моладзі». Яны ператвараюць музыку ў набор дзікіх гукаў, у самыя незвычайныя сумбурныя гучанні.

А існуе і такое мастацтва, у якім заганная ідэя падаецца ў завуаляваным выглядзе ў разліку на тое, што нейкае зерне рэакцыйнай ідэалогіі ўвойдзе ў свядомасць мас. Характэрна, што абедзве гэтыя плыні ўжываюць для сваіх мэт адзіны сродак — яны пазбаўляюць музыку здаровай асновы народна-песеннай творчасці, традыцый, выпрацаваных кампазітарамі-класікамі. «Наватарства ў што б там ні стала» — іх спекулятыўны дэвіз.

На жаль, за апошні час і ў творчасці некаторых савецкіх кампазітараў стаў назірацца нездаровы адыход ад нацыянальнай асновы, пра што, у прыватнасці, гаварылася на сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі мастацкай інтэлігенцыі. Ілжэнаватары спрабуюць давесці, што інтанацыйны склад традыцыйнага фальклору быццам бы з'яўляецца анахранізмам у наш час, і таму нібыта патрэбна ствараць нейкую новую музычную мову, якая адпавядала б новым патрабаванням. Сёй-той нават раіць пераходзіць ад нацыянальных народных да **агульначалавечых** музычных інтанацый. Такая пастаноўка пытання ў музыказнаўстве і кампазітарскай практыцы карэнным чынам супярэчыць асноўнаму палажэнню марксісцка-ленінскай эстэтыкі, згодна якога агульначалавечае можа выяўляцца толькі праз нацыянальнае.

Іншая справа, што ў нашу савецкую эпоху адбываецца больш інтэнсіўны шырокі працэс узаемадзеяння, узаемаўплыву нацыянальных музычных культур. Гэта зусім зразумела. Народы нашай краіны, жывучы дружнай, адзінай, маналітнай сям'ёй, не могуць замыкацца ў рамкі толькі сваёй нацыянальнай культуры — спяваць адны свае песні, танцаваць толькі свае танцы. Усё самае цікавае, новае, каштоўнае з літаратуры, музыкі, песень, што нараджаецца ў адной якой-небудзь рэспубліцы, хутка становіцца здабыткам братоў-суседзяў. Таму няма нічога дзіўнага, калі, напрыклад, у сучасны беларускі песенны фальклор, у творы беларускіх кампазітараў пранікаюць інтанацыйныя элементы з лепшых песень народаў Прыбалтыкі, Украіны.

Але ж сёй-той, як я ўжо гаварыў, заклікае да нівеліроўкі, да «агульначалавечай» музычнай мовы кампазітараў, што абсалютна няправільна і памылкова.

Нельга адабраць у народа шматвекавую музычную культуру (ён любіць сваю песню і ніколі не дазволіць ставіцца да яе пагардліва), як нельга пазбавіць яго роднай мовы, на якой ён гаворыць спрадвеку.

Паняцце ідэйнасці і мастацкасці менавіта і звязана з такім творчым метадам, які спалучае ў сабе і абагульненне вопыту кампазітараў-класікаў, і выкарыстанне ўсёй багатай спадчыны народна-песеннай творчасці як лепшай традыцыйнай, так і сучаснай, народжанай садружнасцю народаў Савецкага Саюза.

НАС ПАВІННА хваляваць і яшчэ адно пытанне, якое датычыць шляхоў далейшага развіцця савецкай музыкі, — пытанне аб джазе.

Гісторыя джазавай музыкі не такая ўжо вялікая. Першыя джаз-аркестры паявіліся толькі ў другім дзесяцігоддзі нашага стагоддзя ў ЗША. Сваю назву джаз атрымаў па прозвішчу першага стваральніка аркестра такога тыпу — амерыканскага негра Джазбо Брауна. Спачатку рэпертуар джаз-аркестраў быў вельмі невялікі, яны выконвалі галоўным чынам творы танцавальнай музыкі — факстроты, уін-стэпы, блюзы, чарльстоны, танга, румбы і г. д. Большая частка названых танцавальных форм у сваёй рытма-ладавай аснове была запазычана з народнай музыкі амерыканскіх неграў і з некаторых іспанскіх мелодый. Паяўленне джазавай музыкі ў сваім першапачатковым выглядзе было заканамернае. Аднак далейшае развіццё яго ў ЗША і краінах буржуазнай Еўропы пайшло не па лініі культывацыі элементаў народнага танцавальнага мастацтва, а па лініі ўзмацнення экзатычных элементаў. Вострая рытмічная своеасаблівасць танцавальнай негрыцянскай музыкі паступова са сродку ператварылася ў самамэту. Арыгінальная ладавая структура песень і танцаў амерыканскіх неграў пазбылася ў большасці выпадкаў народна-песенных традыцый. Курс быў узяты на стварэнне «звышэкзатычных» музычных твораў, якія б казыталі нервы буржуа. У выніку ад нацыянальнай асновы джазавай музыкі і джазавага выканання засталіся рожкі ды ножкі і пышна расквітнела псеўданароднае, псеўданегрыцянскае мастацтва. Гэтаму садзейнічала яшчэ паяўленне пісклівых і траскучых флексатонаў, «музычных піл», ударных інструментаў, а таксама пашырэнне дыяпазону музычных форм, якія выкарыстоўваюцца ў джаз-аркестрах.

У гісторыі музычнага мастацтва — гэта не першы выпадак, калі сапраўды нацыянальнае, а, значыць, і сапраўды эмацыянальнае падмяняюцца псеўданародным, псеўдаэмацыянальным. Можна спаслацца на модны ў свой час жанр так званага цыганскага раманса, які па форме выкарыстоўваў пэўныя элементы цыганскай народнай песні і танца, а па змесце зводзіўся або да слязлівай, надрыўнай экзатычнай лірыкі, або да гэткай заліхвацкай, разбэшчанай весялосці п'янаватых купчыкаў.

Вельмі правільную характарыстыку даў сучаснаму амерыканізаванаму джазу вялікі савецкі пісьменнік М. Горкі ў вядомым памфлеце «Музыка тоўстых». Джаз — не проста від забаўляльнай музыкі капіталістычнага свету, а вельмі яркае, недвухсэнсоўнае выяўленне яго ідэалогіі, якая імкнецца адвесці ўдумлівага чалавека ад рэальнага ўспрыняцця рэчаіснасці, ад барацьбы за сваю светлую будучыню ў свет суцэльных абстракцый або ў галіну экзатычнага, «звышпачуццёвага», а часам і непрыкрыта сексуальнага.

Я не заклікаю да забароны наогул джазавай музыкі.

Летась у Мінску гастраліраваў японскі джаз-аркестр. Як правіла, такія аркестры камплектуюцца з высокакваліфікаваных музыкантаў, таму ўзровень выканаўчага майстэрства іх высокі. І цікава адзначыць: сапраўды японскія мелодыі, акаймаваныя спецыфічнай джазавай гарманізацыяй і інструментоўкай, гучалі добра, прыемна, таму што ў дадзеным выпадку маналітнасць зместу і формы стваралі паўнацэнны эмацыянальны вобраз. Але вось загучалі творы, напісаныя ў тыповай манеры амерыканскага камерцыйнага джаза, і слухач трапіў у палон громападобнай сутаргавай музыкі. Дзе ўжо тут гаварыць пра нармальныя чалавечыя эмоцыі... Перад вамі — майстэрства формы, але формы, прасякнутай варожай савецкаму чалавеку ідэалогіяй.

Як жа крыўдна і балюча становіцца, калі бачыш, што ў нашу савецкую музыку таксама пранікаюць элементы дэкадэнцкага буржуазнага мастацтва. Хачу, каб мяне правільна зразумелі: я не супраць выкарыстання джазавых элементаў у творчасці нашых кампазітараў наогул. Можна прыгадаць, напрыклад, выдатнае супрацоўніцтва І. Дунаеўскага з папулярным джаз-аркестрам Л. Уцёсава і створаную імі музыку да кінафільма «Вясёлыя рабяты». Тут і аўтар, і выканаўчы калектыў, узяўшы ўсё патрэбнае і каштоўнае ад джазавай музыкі, зусім не пазбавілі свой твор рэалістычных рысаў — ён глыбока эмацыянальны і надоўга запамінаецца. Яго бліскучая форма знаходзіцца ў поўным адзінстве з жыццярадасным зместам.

А вось некаторыя нашы маладыя кампазітары, як, напрыклад, таленавіты Я. Глебаў, пішуць лёгкія аркестравыя мініяцюры, салонныя песенькі, якія нічога агульнага не маюць з савецкім рэалістычным эстрадным мастацтвам.

У гэтых адносінах вельмі нядобрую ролю адыгрывае аркестр Беларускага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Б. Райскага. Рэпертуар гэтага аркестра засмечаны творамі, якія не могуць выхоўваць у савецкіх радыёслухачоў высокі мастацкі густ. Праўда, у рэпертуары гэтага аркестра ёсць некалькі твораў, у аснову якіх пакладзены ўзоры беларускага музычнага фальклору. Але што засталося ад напеўных беларускіх народных мелодый у гэтых джазавых апрацоўках!

Народная песня — гэта той каштоўны камень, які ва ўмелых руках кампазітара-майстра можа зайграць яркімі прыгожымі фарбамі. Аднак, каб дасягнуць гэтага, трэба пранікнуць у самую сутнасць складу песні, глыбока зразумець яе ідэйна-мастацкі змест і толькі пасля гэтага шукаць сродкі найлепшага ўжывання песні ў аркестравым ізлажэнні. Нельга ствараць гарманізацыю, вынаходзіць інструментоўку, цалкам адарваўшы іх ад зместу песні і яе меладычнай асновы. У адваротным выпадку атрымліваюцца фармалістычныя фантазіі, сюіты, дзе назвы пакладзеных у аснову народных песень з'яўляюцца толькі ўсеасаблівай шырмай. А па сутнасці — гэта вычварныя аркестроўкі і аркестравае ізлажэнне гэтых песень.

На жаль, Беларускае радыё часта прапагандуе такія музычныя «эксперыменты».

На вялікіх будоўлях, у вялікіх рабочых калектывах і ў калгаснай вёсцы такая «мастацкая» практыка не прывіваецца, хоць часам і там сустракаюцца пераймальнікі і аматары «новага курсу» ў музыцы. У асноўным жа наша моладзь непарыўна звязана з народна-песеннай культурай, глыбока эмацыянальнай творчасцю кампазітараў-класікаў, з перадавым савецкім рэалістычным мастацтвам. У сельскай самадзейнасці не знойдзеш рафінаваных музычных калектываў, якія схіляліся б перад любым імпартным ідэалагічным таварам. Там ствараюцца новыя песні пра выдатных савецкіх людзей, новыя жыццярадасныя танцы, а не рок-н-ролы і твісты, там сам почырк выканаўчых калектываў прасякнуты духам нашай рэчаіснасці.

Абавязак кампазітараў — ствараць сапраўды народную, сучасную савецкую эстрадную музыку. Неабходна больш пісаць добрых твораў для эстрады, у тым ліку і для джаз-аркестраў.

Трэба памятаць, што само паняцце майстэрства ўключае ў сябе, у першую чаргу, высокую ідэйнасць творчасці, народнасць і даступнасць успрымання. Голае ж майстэрства — зброя, якая не страляе, а калі і страляе, дык па сваіх.

НЕКАЛЬКІ слоў пра выкананне твораў вакальнага эстраднага жанра. Мала таго, што вельмі многа напладзілася ў нас пашлаватых безгустоўных лірычных песенек (прычым, лірыка гэтая вельмі слінявая, хоць і прэтэндуе на вонкавую прыгажосць і танны поспех), дык яшчэ з'явілася і цэлая плеяда выканаўцаў, якія спрабуюць замяніць нармальнае гучанне чалавечага голасу скуголена-дэкламацыйнай манерай выканання. Гэтая манера падобна на шансанетнае спяванне і павышана-сексуальнае выкананне «тапёраў ад вакалу» сучасных заходнееўрапейскіх начных кабарэ і дансінгаў.

Чаму ж безгалосыя выканаўцы да гэтага часу выступаюць на падмостках савецкай прафесіянальнай эстрады? Чаму сапраўднае вакальнае майстэрства падмяняецца фальсіфікаваным выкананнем у мікрафон (голасу ж не хапае!)? Такая манера выканання, натуральная для нізкапробных рэстаранных эстрад капіталістычных краін, не мае права на жыццё ў нашай краіне.

Не такія ўжо бедныя мы на добрыя галасы. У нас ёсць нямала маладых таленавітых выканаўцаў-вакалістаў сярод удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Ды і прафесіянальныя музычныя навучальныя ўстановы кожны год выпускаюць таленавітых спевакоў.

У савецкай эстрады — вялікая будучыня. Узняць наша эстраднае мастацтва на высокі ўзровень — задача не толькі стваральнікаў музыкі, але і канцэртных арганізацый рэспублікі, якія яе прапагандуюць.

ПЕСНЯЙ І ПЛАКАТАМ

У любую пару года імчацца па вясковых дарогах аўтамашыны з чырвонымі сцяжкамі і кароткім надпісам: «Агітбрыгада». У кожным такім аўтаклубе — незвычайныя пасажыры: удзельнікі мастацкай самадзейнасці, людзі, якія валодаюць палымяным словам агітатара і прапагандыста рашэнняў партыі і ўрада.

Новым зместам напоўнілася цяпер дзейнасць агітбрыгад. Іх компас — Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, велічныя планы пабудовы камуністычнага грамадства ў нашай краіне. Сёння ў рэспубліцы больш трох тысяч агітацыйна-мастацкіх калектываў, а гэта дзесяткі тысяч добраахвотных памочнікаў партыі. Аб тым, як працуюць гэтыя энтузіясты, што іх турбуе, мы хочам расказаць на прыкладзе агітбрыгады Клімавіцкага раённага Дома культуры.

Два гады назад клімаўцы былі не апошнімі ўдзельнікамі рэспубліканскага агляду агітбрыгад. Поспех акрыліў. Вярнуўшыся з Мінска, агіткалектыў узяўся за работу. Пачынаючы паэт Міхась Гарнак напісаў новы сцэнарый — «Калгаснае вяселле». Яго першапачатковы варыянт абмяркоўваўся ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці Дома культуры. Многа каштоўных і карысных парад пачуў тады аўтар. Напрыклад, па задуме М. Гарнака малады і маладая павінны быць калгаснікамі перадавых гаспадарак раёна. А ўдзельнік агітбрыгады трактарыст раённага аддзялення «Белсельгастэхніка» М. Кухараў прапанаваў, каб малады быў механізатарам адстаючага калгаса. Гэта дало б магчымасць выкрыць прычыны яго адставання і адначасова паказаць эканамічна моцную гаспадарку, у якой працуе маладая. Пасля абмеркавання плана сатырычнага агляду аўтар зноў узяўся за работу. Потым мастацкі кіраўнік агіткалектыву Л. Ячнеў стварыў музычнае афармленне. Толькі тады, калі агляд яшчэ раз абмеркавалі, пачаліся першыя рэпетыцыі.

На прэм'еру «Калгаснага вяселля» былі запрошаны работнікі райкома партыі і камсамольскія актывісты, настаўнікі, урачы, кіраўнікі некаторых калгасаў і саўгасаў. Яны таксама далі нямала слушных парад аўтару і артыстам. Усё гэта памагло стварыць мэтанакіраваны, музычна стройны, ідэйна вытрыманы сцэнарый.

На працягу ўсяго «вяселля» глядач смяецца не толькі з каламбураў свата, сваякоў і сяброў жаніха, якія прыехалі па маладую, але і з безгаспадарчасці бесклапотных кіраўнікоў іх калгаса. Бацька маладой патрабуе за яе незвычайнага выкупу — кукурузы, буракоў, малака, мяса. Сват не можа даць усяго гэтага: у яго калгасе кукуруза і буракі не ў пашане.

Сатырычны агляд «Калгаснае вяселле» карыстаўся ў гледачоў няменным поспехам. Аднак выступленні агітбрыгады не абмяжоўваліся паказам толькі гэтай інсцэніроўкі. Кожны раз у праграму канцэрта ўключаліся ўсё новыя факты і прыклады з жыцця тых калгасаў і саўгасаў, дзе выступалі клімавіцкія артысты. Удасканальваць старыя формы прапаганды, шукаць новыя — пра гэта заўсёды клапоціцца агіткалектыў Дома культуры. Услаўленне перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, прапаганда іх метадаў працы займае галоўнае месца ў яго рабоце. Перш чым агітбрыгадзе паехаць у калгас ці саўгас, Дом культуры заказвае ў мясцовай фатаграфіі партрэты перадавікоў, напрыклад, птушніцы саўгаса «Раднянскі» Л. Пракапенкі, механізатара Н. Марчанкі, свінаркі калгаса імя К. Маркса О. Якубенкі і іншых. Гэтыя партрэты складаюць перасоўную Дошку гонару.

Заўсёды ў праграме выступленняў агітбрыгады ёсць раздзел «Пад агонь крытыкі».

Цяпер клімавіцкая агітбрыгада працуе над новым сцэнарыем. Напісаў яго таксама Міхась Гарнак. Называецца ён «Вечарынка ў калгасе». Работы шмат: два разы на тыдзень па тры-чатыры канцэрты за дзень дае агіткалектыў. Гэта пад сілу толькі сапраўдным энтузіястам. Добрага слова заслугоўваюць мастацкі кіраўнік агіткалектыву Л. Ячнеў, дырэктар Дома культуры І. Сімакоў, кандуктар аўтабазы Р. Гулакова, студэнт заваеттэхнікума Ул. Барашкаў, выкавацельніца дзіцячых ясляў Г. Братусева і іншыя.

Агітацыя песняй і плакатам — адзін з дзейсных сродкаў прапаганды рашэнняў партыі і ўрада. На жаль, у агітатрадаў ёсць яшчэ і нямала цяжкасцей. Узяць хоць бы праблему сцэнарыяў выступленняў. Напісаць іх — не лёгкая справа. Таму кіраўнікі агітбрыгад звычайна звяртаюцца за дапамогай у дамы народнай творчасці. Адтуль з вялікай ахвотай прыязджаюць метадысты. Добра? Добра. Але прыедзе іншы метадыст, змайструе за які там тыдзень нешта накшталт агляду, атрымае ганарар і — на самалёт. Нават ні на адной рэпетыцыі не пабудзе. Пройдзе час, дасць агітбрыгада два-тры канцэрты і пераканаецца, што калгаснікам трэба нешта іншае — агляд поспехам не карыстаецца. І тады члены агіткалектыву пачынаюць сваімі сіламі рэдагаваць работу «метадыста», крэсляць тэкст удоўж і ўпоперак, звяртаюцца да сваіх пачынаючых паэтаў і кампазітараў. У выніку сцэнарый набывае больш-менш варты выгляд. І тады аддзел культуры прыходзіць да вываду, што няма сэнсу плаціць грошы (і не малыя) абласным і рэспубліканскім «сцэнарыстам».

Праўда, вінаваты ў гэтым не толькі самі «сцэнарысты». Вельмі часта атрымліваецца так, што ад іх проста не патрабуюць сапраўды мастацкіх рэчаў. Іншы дырэктар Дома культуры не задумваючыся ставіць сваю аўтарытэтную візу: «годны», «выплаціць», абы хутчэй атрымаць сцэнарый і пачаць працаваць. Дарэчы, робіць ён гэта часта таму, што больш пад рукамі нічога няма: авось і гэта сплыве. Заказаць жа сцэнарый прафесіянальнаму паэту ці пісьменніку проста немагчыма: вельмі далёкія яны ад дзейнасці агіткалектываў. А між тым, каму, як не пісьменнікам, трэба было б узяць шэфства над дамамі культуры і памагчы ім па-сапраўднаму наладзіць работу агіткалектываў.

Слаба, на жаль, кіруюць дзейнасцю ўстаноў культуры і некаторыя парткомы вытворчых упраўленняў і партыйныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў.

Клімавіцкая агітбрыгада мае «Кнігу водгукаў», у якой гледачы пакідаюць свае ўражанні, падзякі і прапановы. Яна значна дапамагае агіткалектыву — і ў выбары тэматыкі агітацыйных і канцэртных нумароў, і ў мастацкім афармленні выступленняў. Аднак прапагандысты агітацыйна-мастацкіх брыгад адчуваюць вострую патрэбу і ў іншай дапамозе: з боку прафесіянальных дзеячоў літаратуры і мастацтва, з боку партыйных і камсамольскіх органаў.

А. СУРЫНОВІЧ,
рэдактар-метадыст рэспубліканскага кабінета культасветработы Міністэрства культуры БССР.

ТЫРАЖ — 700 ТЫСЯЧ

У чарговым нумары «Раман-газеты», які выйшаў 700-тысячным тыражом, змешчаны раман Івана Мележа «Людзі на балоце». Аўтарызаваны пераклад на рускую мову зроблены М. Гарбачовым, прадмову да рамана напісаў Іван Шамякін.

«Людзі на балоце», — гаворыцца ў прадмове, — раман глыбока нацыянальны па характарах, каларыту і інтэрнацыянальны па яго гуманістычнаму гучанню. Кніга — аб мінулым, але падзеі тых год асэнсаваны аўтарам з вышыні нашых сённяшніх дасягненняў, паказаны як важны этап у вялікім руху народа да камунізма. І таму раман успрымаецца як твор надзвычай актуальны і сучасны».

ПІСЬМЕННІК І ЧАС

КУДЫСЬЦІ НЕ ТУДЫ...

Аляксей ЗАРЫЦКІ

Неяк адзін малады паэт прачытаў мне некалькі сваіх новых вершаў. Вершы былі добрыя. Але адзін з іх пачынаўся радкамі, у якіх гаварылася, што хмары—гэта вялізныя шэрыя жорны, якія круцяцца ў высокім небе і з-пад іх белай мукой сыплецца снег.

— Навошта так мудрагеліста,—спытаў я,—хіба нельга прасцей? Сказалі б—ішоў снег, і ўсё.

— О не, не,—адказаў паэт,—я столькі часу патраціў, пакуль дадумаўся да гэтых шэрых жорнаў у высокім небе. Нельга бясконца паўтараць: ідзе снег, ідзе дождж. Трэба шукаць новыя вобразы і не баяцца іх складанасці. Мне часам думаецца, што нават Твардоўскі піша занадта проста.

Я прыводжу гэту размову таму, што некаторыя з нашых маладых, ды і не толькі маладых, уяўляюць наватарства ў асноўным як нейкія знаходкі і пераўтварэнні ў галіне формы, не разумеючы ўсёй глыбіні і складанасці гэтай праблемы і блытаючы сапраўдную складанасць, абумоўленую глыбінёй зместу, з наўмыснай ускладнёнасцю, якая выклікана жаданнем прыкрыць беднасць думкі і ўразіць недасведчанага чытача. Пра такіх паэтаў Байран пісаў:

«Он сам нарочно мысль загромождает
(Авось его читатель не поймёт!)»

Аднабаковае разуменне наватарства сустракаецца часам і ў друку. Праявілася яно і ў некаторых артыкулах, надрукаваных у «ЛіМе» ў ходзе дыскусіі. Вось, напрыклад, Ул. Жыжэнка, заяўляючы ў пачатку свайго артыкула, што ён супраць фармальнага наватарства, далей збіваецца з тропу. Гаворачы аб наватарскіх пошуках, ён піша: «Калі памножыць іх на сённяшні небывала высокі эстэтычны, эмацыянальны і інтэлектуальны ўзровень масы чытачоў, робіцца зразумелай павышаная цікавасць да твораў прызнаных наватараў—Ю. Бондарава, В. Аксёнава, Г. Бакланава, Б. Балтара, да якіх можна з поўным правам залічыць і В. Быкава».

Вызначыўшы кагорту наватараў у нашай сучаснай прозе, аўтар пераходзіць да вызначэння наватараў у нашай сучаснай паэзіі. «Сёння,—піша ён,—наватарскія вершы Я. Еўтушэнкі і Э. Межалайціса, Р. Раждзественскага і А. Вазнясенскага ўжо нікога не здзіўляюць». Толькі з аднаго пераліку прозвішчаў тых празаікаў і паэтаў. якіх Ул. Жыжэнка лічыць наватарамі ў нашай сучаснай савецкай літаратуры, відаць, наколькі ён далёкі ад усебаковага і глыбокага разумення праблемы наватарства. Сапраўды, як гэта можна лічыць наватарам В. Аксёнава, які па сутнасці з'яўляецца пераймальнікам не лепшых бакоў творчасці некаторых заходніх пісьменнікаў. Наіўна гаварыць і аб наватарстве А. Вазнясенскага, творы якога прасякнуты духам фармалізму, жаданнем паказаць сябе—глядзіце, маўляў, як я ўмею загінаць. Якое ж гэта наватарства? Звыш трыццаці год назад адзін з паэтаў пісаў, што «пока в аорте кровь дика», ён—«цыркач стиха» будзе «ўрэзваць» розныя штучкі. Пабачылі мы ўжо за свой век гэткіх «циркачей стиха» нямала. Бачылі і забылі, бо паэзія не цырк і ёй не патрэбны літаратурныя клоуны, якія з-за адсутнасці сапраўднай глыбокай думкі і глыбокага жыццёвага роздуму спрабуюць прыцягнуць да сябе ўвагу рознымі фармальнымі выкрутасамі, неверагоднымі слоўнымі піруэтамі.

Усё гэта, таварыш Жыжэнка, мы чулі і бачылі, і не трэба шукаць наватарства ў тым, што даўно адкінута на сметнік гісторыі літаратуры. Сам Вазнясенскі, неяк адчуўшы негрунтоўнасць і хісткасць сваіх пазіцый, заяўляў, праўда, не без прывычнага для яго пазёрства і самалюбавання:

Как мне нужна в поэзии
Святая простота,
Но мчит меня по лезвию
Куда-то не туда.

Яўна «кудысьці не туды» мчыць і некаторых крытыкаў, якія паўсталі на абарону ілжэнаватарства. Таксама, на маю думку, вельмі аднабакова і, калі можна так сказаць, з пункту гледжання толькі «літаратурнага рамяства» гаворыць аб наватарстве М. Стральцоў у сваім артыкуле «Зробім традыцыяй пошукі», якім некалькі месяцаў назад адкрывалася дыскусія.

«Трэба толькі быць чуйным да пошукаў лепшых сучасных пісьменнікаў,—сцвярджае М. Стральцоў,—каб адчуць—сучасны стыль існуе. Яго элементы ёсць у творчасці Хэмінгуэя і Ляонава, Сент-Экзюперы і Бёля, Аксёнава і Вазнясенскага, Бондарава і Быкава, Брыля і Навуменкі. Ёсць лаканізм, ёсць падтэкст, асацыятыўнасць мыслення. І вялікі інтэлектуалізм

РОЗДУМ
МЕРКАВАННІ
ПАЛЕМІКА

у поглядзе на жыццё, вялікая філасафічнасць». Наколькі я зразумеў, сэнс гэтага выказвання ў тым, што існуе нейкі «сучасны стыль», стваральнікамі якога з'яўляюцца ў першую чаргу вышэйпамянёныя пісьменнікі-наватары, якія не пажадалі «ступіць на сцежку традыцыйнасці, архаічнасці». Але стыль—гэта разуменне не вузка-прафесіянальнае, гэта не толькі пэўная манера пісьма. Стыль вызначаецца ўсёй сутнасцю пісьменніка—яго сацыяльнай і партыйнай накіраванасцю, зместам, які ён нясе, і, нарэшце, яго індывідуальнымі асаблівасцямі. Таму нельга, як гэта робіць Стральцоў, вылучаць у адну групу наватараў пісьменнікаў, якія стаяць на розных ідэйных пазіцыях. Кожны навабранец ведае, што нельга ў адну абойму ўганяць патроны ад вінтовак розных сістэм. Нічым не абгрунтаваны і сам выбар аўтараў. Не разумею, як гэта Бёль, пра якога адзін з нашых крытыкаў зусім слушна сказаў, што ён мог бы свабодна памясціцца ў калісцы Дастаеўскага, становіцца ў артыкуле Стральцова наватарам у сусветным маштабе. Альбо ўзяць таго ж Аксёнава, які, часам, забываючы аб вялікіх традыцыях рускай класічнай і савецкай літаратуры, наследуе нават таму ж Бёлю. Якое недаравальна вузкае і няправільнае разуменне наватарства! Як гэта яго можна бачыць там, дзе ім і не пахла. А што гэта такое, наогул, «сучасны стыль»—хачу я запытацца ў М. Стральцова? Ці існуе ён? Па-мойму, можна з поўным правам сведчыць, што творы Шэкспіра і Талстога ва ўсякім выпадку не менш лаканічныя і маюць не менш значны падтэкст, асацыятыўнасць мыслення, інтэлектуалізм і філасафічнасць, чым творы любога з пісьменнікаў, названых М. Стральцовым у якасці наватараў. Такім чынам і ў таго невядомага старажытнага песняра, які напісаў «Слова аб палку Ігаравым», таксама ёсць элементы гэтага «сучаснага стылю». Згодна вызначэнню М. Стральцова, тады і гэтага старажытнага песняра, і нават ягонага папярэдніка міфічнага Баяна можна паставіць побач з Вазнясенскім і Бёлем. Вось да якой блытаніны даводзіць абмежаванае і павярхоўнае разуменне наватарства.

У артыкуле А. Мальдзіса «Каб з пер'я вырасталі галубы» таксама, як і ў яго папярэднікаў, нідзе не сустрэнеце ніводнага слова аб сацыялістычным рэалізме, аб партыйнасці і народнасці літаратуры. А. Мальдзіс карыстаецца іншымі катэгорыямі і разглядае літаратурныя творы з пункту гледжання кібернетыкі. І, чытаючы яго артыкул, многія мясціны ўспрымаеш не як сур'ёзныя крытычныя сцвярджэнні, а як урыўкі з нейкай пародыі. Вось як, напрыклад, Мальдзіс гаворыць аб наватарстве:

«Мне здаецца, што сутнасць пошукаў, наватарства заключаецца, калі зноў звярнуцца да кібернетычнай тэрміналогіі, у бесперапынным абнаўленні карыснай інфармацыі». А вызначаючы, што такое мастацкі твор, ён піша наступнае:

«З пункту гледжання кібернетыкі мастацкі твор—гэта камунікат, які ўключае ў сябе акрэсленую інфармацыю (думкі, пачуцці). Прытым і тут інфармацыя можа быць карыснай, інфармацыйнай расцягнутасцю, інфармацыйным шумам ці, часцей за ўсё, спалучэннем усяго гэтага ў адным непаўторным цэлым. Звернемся зноў да прыкладу. У дыялогу —«Ты мяне кахаеш?—Апчхі!—Так, я кахаю цябе»—апошнія тры словы з'яўляюцца яўнай інфармацыйнай расцягнутасцю, бо ўся карысная інфармацыя ўжо перададзена словам «так». Гукі ж «апчхі»—інфармацыйным шумам, які мае выпадковы характар». Трэба сказаць, што гэтага «інфармацыйнага шуму» надта ўжо многа ў артыкуле Мальдзіса, і разуменне ім наватарства зводзіцца фактычна да таго, што наватары пішуць лаканічна і карыстаюцца падтэкстам. Не дзіва, што пры такім страшэнна збедненым разуменні наватарства ў лік наватараў заносяцца і Еўтушэнка, і Вазнясенскі, і Аксёнаў, і Карпюк.

Мне неяк давялося прачытаць адну працу аб сектантах. У ёй гаворыцца, што кожнае секта і сектачка мела свайго ўласнага Хрыста-Месію. Такім Хрыстом у хлыстоў быў нейкі Іван Суслаў, у скапцоў—Аляксандр Шылаў, а ў прыгункоў—Максім Рудамёткін альбо Камар-Крыстос, цар духоўных, урачыста каранаваны сваімі прыхільнікамі ў нейкай вёсцы. І ў кожнага з гэтых хрыстосікаў былі свае прарокі, якія хадзілі па гарадах і вёсках. Усё гэта ў пэўнай меры нагадвае тое, як у нас некаторыя крытыкі садзяць на наватарскі трон, як адкрывальнікаў новага ў літаратуры, аўтараў яшчэ не зусім спелых твораў. Не так даўно на пасяджэнні рэдсавета Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, дзе зусім слушна было ўзнята пытанне аб павышэнні якасці першай кнігі, аб большай адказнасці за яе і з боку аўтара і з боку рэдактара, некаторыя далёка не маладыя пісьменнікі ўсур'ёз заяўлялі, што першая кніга вершаў А. Наўроцкага наватарская і была б з'явай у нашай паэзіі, каб не некалькі ўключаных у яе няўдалых вершаў. Заява, вядома, яшчэ не з'ява, і я глыбока ўпэўнены, што з'ява ў літаратуры вызначаецца не ў вузкім коле літаратараў.

Я гэтым не збіраюся адмаўляць таго, што ў кнізе А. Наўроцкага ёсць цікавыя пошукі новага. Ён, як і кожны здольны малады паэт, выпрацоўвае свой уласны почырк. Але ж нельга гэтыя пошукі ўласнага стылю, выпрацоўку свайго голасу выдаваць за наватарства.

Сапраўднымі вялікімі наватарамі былі вялікія пісьменнікі. Яны з'яўляюцца калумбамі літаратуры. Якімі вялікімі адкрыццямі ў літаратуры былі «Яўгеній Анегін» Пушкіна, названы энцыклапедыяй рускага жыцця, «Вайна і мір» Талстога, дзе з незвычайнай мастацкай сілай быў раскрыты і ўслаўлены подзвіг рускага народа ў 1812 г., альбо «Маці» Горкага, твор, які лёг краевугольным каменем у аснову літаратуры сацыялістычнага рэалізму. А хіба не зрабіў мастацкае адкрыццё эпохі грамадзянскай вайны Шолахаў у «Ціхім Доне», адным з лепшых раманаў гэтага стагоддзя? А колькі новых адкрыццяў зрабіў у паэзіі Маякоўскі, пясняр Кастрычніка і нашай партыі! І кожнаму ясна, што ён стаў вялікім паэтам і вялікім наватарам не таму, што разбіваў радкі лесвічкай і ўжываў новыя рыфмы, а таму, што нёс у сваіх творах вялікі змест, чым і вызначаецца перш за ўсё сутнасць наватарства. Не дапамогуць падтэкст і лаканічнасць таму, у каго бедны тэкст. І Д. Фурманаў, і М. Астроўскі, якія стварылі бессмяротныя мастацкія вобразы герояў новай сацыялістычнай эпохі—вобразы Чапаева і Паўкі Карчагіна, з'яўляюцца наватарамі ў поўным сэнсе гэтага слова, хаця ў іхніх творах няма «фармальных навінак», і яны могуць прыхільнікам «касмічнага стылю» здацца нават старамоднымі.

Нямала выдатных адкрыццяў у паэзіі зрабіў і наш сучаснік Аляксандр Твардоўскі, сапраўдны наватар, які ўзбагаціў нашу савецкую літаратуру цудоўнымі вобразамі Мікіты Маргунка, Васіля Цёркіна і лірычнага героя паэмы «За даллю—даль». А якімі наватарамі былі Купала і Колас! Яны зрабілі мастацкае адкрыццё цэлай краіны—Беларусі. І вельмі слушна сказаў некалі ў адным са сваіх артыкулаў адзін наш крытык, што, калі б марсіянам, якія нічога не ведаюць аб Беларусі, трапіла «Новая зямля» Коласа, то, прачытаўшы толькі гэту адну паэму, яны мелі б даволі грунтоўнае ўяўленне аб беларускім народзе дарэвалюцыйнага часу.

Такім чынам мы бачым, што сапраўднае наватарства ў літаратуры заўсёды непарыўна звязана з новым вялікім зместам, са стварэннем новых мастацкіх вобразаў, новых характараў, узняццём новых пластоў жыцця. А форма заўсёды абумоўліваецца гэтым зместам. І калі новы змест уладарна патрабуе новых форм, то тады знаходзяцца і яны. Творчасць Маякоўскага можа служыць лепшым доказам гэтаму. Таму ні ў якім разе нельга так здрабняць, прыбядняць і абмяжоўваць праблему наватарства, як гэта зрабілі ў сваіх артыкулах Стральцоў, Жыжэнка, Мальдзіс і некаторыя іншыя, залічваючы часам у наватары пісьменнікаў, накшталт Вазнясенскага, якія спрабуюць прыцягнуць да сябе ўвагу слоўнай клаунадай, фармалістычным трукацтвам.

Думаю, што, гаворачы аб наватарстве, нельга забываць аб сучаснай тэме. Тыя пераўтварэнні, якія цяпер адбываюцца ў нашай калгаснай вёсцы, будаўніцтва новых грандыёзных прадпрыемстваў, нашы незлічоныя Салігорскі, Светлагорскі, Брацкі, Ангарскі—вось бязмежнае і ўдзячнае поле для дзейнасці пісьменніка, той аператыўны прастор, дзе можна знайсці і прататыпы новых характараў, і новыя сюжэты—карацей кажучы, новы змест, які адзін толькі можа нарадзіць новую форму.

У гады культу асобы нярэдка з'яўляліся пампезна-дэкаратыўныя творы, якія цяпер, у час поўнага аднаўлення ленінскіх норм нашай сацыялістычнай дэмакратыі, падвергліся справядлівай крытыцы. Але некаторыя з нашых літаратараў, празмерна захапіўшыся крытыкай, пачалі адвяргаць і тое, што з'яўляецца кроўным здабыткам нашага мастацтва. Знайшліся нават і такія, што ў парыве крытыканцтва, відаць, дзеля таго, каб паказаць сваю ўяўную смеласць, пачалі замахвацца і на класіку. Так, В. Говар, у сваім артыкуле «Энергія паэтычнага вобраза» пагардліва ставіцца да Шостай сімфоніі Чайкоўскага, да Коласа і Купалы. Вось што ён піша:

«У Купалы і Коласа сустракаецца вось такое: хмары закрылі сонца—чалавечае цемрашальства закрыла свабоду. Але тады параўноўваліся рэчы, блізкія адна да другой. А зараз з'явіліся больш глыбокія асацыяцыі. Для іх характэрна вялікая рухомасць, больш арыгінальнае і непасрэднае ўспрыняццё свету, большая псіхалагічная складанасць, ёмістасць вобразаў». Вельмі непрыемна чытаць гэтую прэтэнцыёзную пісаніну.

В. Говара не зусім «устраивают» Чайкоўскі, Колас і Купала, а Ул. Жыжэнку не зусім «устраивает» Гамер і яго мова, і крытык выказвае з гэтай прычыны наступнае:

«Творца «Іліяды» і «Адысеі», мабыць, ахвотна ахвяраваў бы палову сваіх гекзаметраў, калі б ведаў, што ад гэтага ніколькі не пацерпіць змест: легендарнага Гамера вымушаў да нястрымнага красамоўства ўзровень мыслення старажытных грэкаў, абмежаваная колькасць у мове слоў-паняццяў, змест якіх даводзілася перадаваць апісальна праз шматлікія метафары і параўнанні».

Цікава, што ўсіх гэтых «высокапатрабавальных» крытыкаў, якіх не задавальняюць Гамер, Чайкоўскі, Купала і Колас, зусім задавальняюць Еўтушэнка і Вазнясенскі як наватары і г. д. і да т. п. Не дзіўна, што тыя самыя людзі, якія так ставяцца да вялікіх класікаў, з нецярпімай пагардай гавораць і аб многіх творах нашых таленавітых пісьменнікаў—сучаснікаў старэйшага пакалення. Паслухаць іх, дык быццам у трыццатыя і саракавыя гады ў нас нічога выдатнага не было створана. Я прывяду толькі некалькі прыкладаў з галіны беларускай паэзіі, каб абвергнуць гэтую наскрозь ілжывую думку. Хіба не напісаў 26-гадовы Пятрусь Броўка выдатны паэтычны твор «Праз горы і стэп», а 28-гадовы Аркадзь Куляшоў — шырокавядомую паэму «Сцяг брыгады», а 30-гадовыя Валянцін Таўлай і Антон Бялевіч — такія паэмы, як «Таварыш» і «Сям'я», а 33-гадовы Змітрок Астапенка — «Эдэм». А колькі ў трыццатыя і саракавыя гады тымі ж Броўкам, Куляшовым, Танкам, Панчанкам, Лужаніным, Кірэенкам, Бялевічам, Таўлаем, Засімам, Віткам, Вялюгіным было створана

[Заканчэнне на 4-й стар.].

Цесную сувязь з бібліятэкамі падтрымліваюць работнікі Магілёўскага абласнога бібліятэчнага калектара. Іх падборы і адпраўцы кніг яны ўлічваюць профіль бібліятэк, попыт іх чытачоў.

Да Ленінскіх дзён калектыў калектара выконвае новыя заказы бібліятэк на творы Ул. І. Леніна і літаратуру пра Ільіча. Карэспандэнт БЕЛТА Н. Жалудовіч сфатаграфаваў загадчыцу аддзела камплектавання Кацярыну Пятроўну Ліфанчук, камплектоўшчыцу Нэлю Барысаўну Рубіну і адборшчыцу Валянціну Ісакаўну Міхалап у час падбору кніг для сельскіх бібліятэк.

ПРЫСВЕЧАНА Д. БЕДНАМУ

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Ул. І. Леніна адкрыта выстаўка, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння Д. Беднага. На выстаўцы экспануюцца кнігі паэта, выдадзеныя ў розныя гады. Сярод іх двухтомнае выданне яго твораў, зборнік «У вогненным коле» (1918), серыя кніг «Бібліятэка Дзям'яна Беднага».

Шырока прадстаўлена на выстаўцы літаратура пра творчасць выдатнага савецкага паэта. Тут прамовы М. С. Хрушчова і Л. Ф. Ільічова, у якіх ёсць выказванні пра Дзям'яна Беднага, кнігі В. Цыбенкі «Паэзія Дзям'яна Беднага» і І. Эвентава «Дзям'ян Бедны», аўтарэфераты дысертацый і артыкулы з часопісаў і зборнікаў пра яго творчасць.

* * *

У памяшканні клуба Саюза пісьменнікаў БССР адбыўся вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння выдатнага рускага паэта Дзям'яна Беднага. Вечар адкрыў П. Пестрак. Ён падкрэсліў, што Дзям'ян Бедны быў адным з заснавальнікаў савецкай літаратуры, быў баянам рэвалюцыі.

Цікавы і змястоўны даклад пра жыццё і творчасць Д. Беднага зрабіў І. Гутараў.

Паэт Г. Кляўко прачытаў некалькі вершаў Д. Беднага ў перакладзе на беларускую мову.

ІМЯ НАРОДНАГА ПАЭТА

Хлебаробы калгасных вёсак Зубаўскага і Копыскага сельсаветаў на Аршаншчыне на агульным сходзе вырашылі прысвоіць свайму калгасу імя Янкі Купалы. Пясняр беларускага народа жыў на дачы каля вёскі Ляўкі і стварыў тут вядомыя творы — «Лён», «Вечарынка», «Госці», «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Як у госці сын прыехаў», «Ішоў я пушчай», «Беларусі ардэнаноснай» і інш. Многія з калгаснікаў добра памятаюць Івана Дамінікавіча.

Л. ВЫСОЦКІ.

СХОД СЕКЦЫІ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбыўся справаздачна-выбарчы сход секцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва.

Старшыня секцыі Э. Агняцвет выступіла са справаздачным дакладам. У спрэчках прынялі ўдзел пісьменнікі С. Міхальчук, П. Рунец, А. Якімовіч, Г. Шыловіч, Я. Маўр, А. Пальчэўскі, С. Шушкевіч і А. Шашкоў.

На сходзе адбыліся выбары новага бюро секцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва. У склад яго ўвайшлі — Э. Агняцвет (старшыня), А. Вольскі, В. Хомчанка (намеснік старшыні), Ул. Шахавец, А. Шашкоў, С. Шушкевіч, Г. Шыловіч (сакратар) і А. Якімовіч.

РЭПАРТАЖЫ З МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАЎ

Брагінскі народны

Новая п'еса прачытана. Артысты тэатра абменьваюцца ўражаннямі.

—Расказаць пра Народны тэатр вобласці — такая была ў нас мэта паездкі на Гомельшчыну. Мы ведалі, што такіх калектываў там некалькі. Пра які ж расказаць?

Звярнуліся ў абласны Дом народнай творчасці. Там прапанавалі:

— Калі ласка, можаце з'ездзіць у Рэчыцу—там людзі нядрэнна працуюць. Або ў Мазыр: чулі, пэўне, што і там ёсць Народны тэатр. Урэшце, можна і нікуды з Гомеля не ехаць. Ідзіце ў Палац культуры чыгуначнікаў.

Нехта дадаў:

— Брагін жа яшчэ... Можаце і туды пад'ехаць. Дарэчы, і дырэктар наш там.

Гомель, Рэчыца, Мазыр, Брагін... Спыніліся на апошнім: у першыя тры гарады часцей зазіраюць і газетчыкі, і метадысты дамоў народнай творчасці, і іншыя правяральнікі і памагатыя. Ды, урэшце, і ўмовы для работы, думалася, розныя. Хіба можна параўнаць былы абласны цэнтр Мазыр з гарадскім пасёлкам Брагін? Толькі ад Гомеля—сто сорак кіламетраў!

Але мы былі прыемна здзіўлены: «страказа» — двухкрылы цягавіты самалёцік, за рулём якога сядзелі два зусім маладыя хлопцы, што жартаўліва кпілі з маладых і пажылых пасажырак, якім яшчэ да ўзлёту зрабілася блага, даставіў нас да Брагіна за якіх трыццаць хвілін.

Выйшлі на цэнтральную вуліцу, якую заўсёды беспамылкова пазнаеш у кожным такім гарадку, і спыталі, дзе Дом культуры.

— А вунь!

Перад намі быў доўгі, прыземісты драўляны будынак, які зусім не нагадваў паважаную і самую вядомую ў раённых цэнтрах установу. Стала крышачку ніякавата: чакалі нечага іншага. Міжволі прыгадалася наша першая сустрэча з брагінцамі.

1960 год. Мінск. Сцэна Тэатра юнага гледача. На сцэне—«Канстанцін Заслонаў» у пастаноўцы драматычнага калектыву Брагінскага раённага Дома культуры. Спектакль прайшоў з поспехам, бадай што, на ўзроўні сапраўднага майстэрства. За кулісы да самадзейных артыстаў зайшоў першы выканаўца ролі легендарнага Заслонава, народны артыст СССР Б. Платонаў. Дадому брагінцы павезлі Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР—за першае месца на рэспубліканскім аглядзе самадзейных драматычных калектываў. А ў лютым 1962 года яны ўдастоіліся яшчэ адной высокай узнагароды: звання Народнага тэатра. Успамінаюцца, як кажуць, бляск юпітэраў і гром літаўраў. А тут—шэры, непрывабны будынак.

Заходзім. Ладнаватае фае. Справа і злева—дзверы. Адны прыадчынены. Чутны гаворка, смех.

— Можна бачыць дырэктара?

З-за стала ўстаў невысокі чалавек:

— Я—дырэктар.

Пазнаёміліся, сказалі пра мэту нашага прыезду.

Яфім Міхайлавіч Шайкевіч ажывіўся:

— Рэдкія госці. Што ж, якраз цяпер ідзе рэпетыцыя, у суседнім пакоі. Пойдзем туды. А пасля і пагаворым.

У невялічкім пакойчыку, сцены якога былі завешаны музычнымі інструментамі, за сталом сядзела чалавек восем — дзевяць. Яфім Міхайлавіч таксама падсеў да стала.

— Вось вам і першы кадр, — засмяяўся нехта. — Так сказаць, жыццёвы, не арганізаваны.

Чытка п'есы неўзабаве скончылася. Разгаварыліся. Драматычны калектыў пры раённым Доме культуры працуе з 1947 года. За гэты час пастаўлена больш сарака аднаактовак і амаль дваццаць шматактовых п'ес. Сярод іх — «Рускія людзі» К. Сіманава, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Выбачайце, калі ласка» і «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка, «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «У стэпах Украіны» і «Макар Дубрава» А. Карнейчука, «Выбух» М. Алтухова і М. Гарулёва. Спектаклі брагінцаў неаднаразова бачылі не толькі жыхары шматлікіх вёсак Брагінскага і бліжэйшых раёнаў. Іх добра прымалі ў Хойніках і Камарыне, у Мазыры і Гомелі, у Мінску.

Апошняя работа — спектакль па п'есе ўкраінскага драматурга М. Саўчанкі «Дакладны дыягназ» — была паказана ў лютым, у дзень сорак пятай гадавіны Савецкай Арміі.

Для рэпетыцый і заняткаў розных гурткоў мастацкай самадзейнасці ёсць толькі адзін пакойчык. І думкі ўсіх прысутных абсалютна слушныя: гарадскому пасёлку дужа патрэбен новы, сучасны Дом культуры. Другая бяда — дэкарацыі і касцюмы. Ствараць іх на месцы няма ні сродкаў, ні тых жа магчымасцей. Пакуль што даводзіцца карыстацца так званымі «падручнымі сродкамі». Кожны выканаўца ролі ў большасці выпадкаў сам дбае аб касцюме. Дзякуй яшчэ шэфу — Гомельскаму абласному тэатру. Перадаў ён брагінцам старыя дэкарацыі—заднікі, кулісы, падугі, бутафорыю і рэквізіт. Гэтым рыззём і перабіваюцца. Адкуль чакаць дапамогі—невядома.

Ёсць і іншыя цяжкасці і абмежаванні ў выбары таго ці іншага твора для пастаноўкі. Цяпер брагінцы працуюць, напрыклад, над п'есай І. Собалева «Смяротны прыгавор». Чаму менавіта на яе выпаў іх выбар? Па-першае, дзеянне п'есы адбываецца ў нашы дні. Яна выкрывае агідны твар сектантаў. Галоўнае ж, што прывабіла ў ёй—гэта малая колькасць дзеючых асоб. Гэта таксама мае немалаважнае значэнне. Няхай сабе і склалася ў Народным тэатры пастаяннае ядро энтузіястаў (і не маленькае, не адзін дзесятак чалавек), аднак усе яны—далёка не «вольныя мастакі». Іх праца ў тэатры—толькі вынік вялікай любві да мастацтва, часам жа нават ахвярнасці. Само сабой зразумела, што выканаўцы нават галоўных роляў тут далёка не заўсёды маюць дублёраў.

І ўсё ж людзі працуюць з душой, аддаючы любімай справе кожную вольную часіну, што застаецца пасля работы, сямейных турбот і наогул жыццёвых клопатаў.

Тут, у гэтым невялікім пакойчыку, мы пазнаёміліся з некаторымі энтузіястамі брагінскай самадзейнай сцэны. Мы ўжо называлі прозвішча Яфіма Міхайлавіча Шайкевіча, дырэктара Дома культуры. Ён—нязменны мастацкі кіраўнік драмгурткоўцаў з 1947 года. Трэба было бачыць яго заклапочанасць і зразумелую чалавечую радасць і гордасць за справы свайго калектыву, каб пачаць паважаць гэтага чалавека.

А Яраслаў Кірылавіч Сачок, цяперашні загадчык пастановачнай часткі Народнага тэатра? Трыццаць пяць гадоў свайго жыцця аддаў ён мастацкай самадзейнасці. Дзе б ён ні працаваў — ці на гаспадарчай, ці на савецкай, ці на партыйнай рабоце—заўсёды знаходзіў час для самадзейнай сцэны.

Я. Сачок—даволі пажылы чалавек. Выгадаваў трое дзяцей. Сын працуе інжынерам, дачка—майстрам на Горкаўскім аўтамабільным заводзе. Самы малодшы—дзевяцікласнік. А сам ён па-ранейшаму малады і на дзіва жыццярадасны. Тут, у тэатры, Яраслаў Кірылавіч сыграў ролі Заслонава, Пытляванага, Каліберава, Макара Дубравы, Лявона. Бадай, не было ніводнага спектакля, у якім не быў бы заняты старэйшы артыст Народнага тэатра.

Акрамя гэтага, ён яшчэ і актыўны член агітбрыгады Дома культуры, выдатны чытальнік, асабліва сатырычных і гумарыстычных твораў. Дарэчы, агітбрыгада ў мінулым годзе і сёлета дала ў калгасах раёна больш ста дваццаці канцэртаў.

Сярод шматлікіх грамат, дыпломаў і іншых узнагарод, якімі па праву ганарацца артысты тэатра, нам паказалі мноства фатаграфій — сцэн з ранейшых спектакляў. Некалькі з іх мы адабралі для нашага рэпартажу.

— Пазнаеце? — жартавалі брагінскія артысты, паказваючы нам адну з гэтых фатаграфій.—Так, гэта Лявон і Клава з «Лявоніхі на арбіце». Лявон — Яраслаў Кірылавіч, а Клава—Марыя Арцёмаўна Лазько.

Маладзенькай бібліятэкаркай прыехала Марыя Лазько ў Брагін. Было гэта ў 1948 годзе. З таго часу мінула пятнаццаць гадоў. Марыя Арцёмаўна стала загадчыцай дзіцячай бібліятэкі. І ні на год не разлучалася са сцэнай.

Другі здымак—сцэна са спектакля «Выбух». У ёй заняты артысты малодшага пакалення, самыя маладыя ўдзельнікі калектыву. Машыністка гестапа — Францэска Лысенка, мастацкі кіраўнік Дома культуры; нямецкі салдат—Леанід Каваленка, падпольшчык Макар—Валянцін Гардзеенка.

Валянцін завочна вучыцца ў Гомельскім музычна-педагагічным вучылішчы і працуе настаўнікам спеваў у Брагінскай першай сярэдняй школе.

А з Леанідам Каваленкам мы зноў сустрэліся познім вечарам, калі ўсе артысты пайшлі ўжо дахаты. У тым жа невялічкім пакойчыку Дома культуры ён праводзіў заняткі з удзельнікамі духавога аркестра. Прыехаў ён у Брагін пасля заканчэння Гомельскага музычнага вучылішча і, думаецца, асеў тут назаўсёды. Менш чым за два гады ён паспеў сыграць некалькі роляў. Бадай, самая ўдалая яго работа—вобраз старшыні райвыканкома Глуздакова з «Лявоніхі на арбіце».

Пазнаёміліся мы і з іншымі самадзейнымі артыстамі: з рэнтгентэхнікам раённай бальніцы Уладзімірам Арцюшэнкам, інструктарам парткома Брагінскага вытворчага ўпраўлення Міхаілам Мачуленкам, з сакратаром райкома камсамола Еўдакіяй Хамяковай.

А да аднаго са старэйшых акцёраў—Віталія Іванавіча Лысенкі—зайшлі дадому. Засталі яго сярод дзяцей. Васьмікласніца Ларыса і сямікласніца Валя расказвалі бацьку пра свае школьныя навіны. Але, мусіць, найбольш цікавым было тое, аб чым расказвала Танечка, якая толькі што прыйшла з дзіцячага садзіка.

Віталій Іванавіч — выкладчык гісторыі. На сцэне з 1947 года, адразу ж пасля дэмабілізацыі з арміі.

— Мо таму, — смяецца ён,—мне і даручаюць іграць немцаў: і ў «Выбуху», і «Рускіх людзях», і ў «Канстанціне Заслонаве».

Прызнаемся, за час нашага кароткага знаходжання ў Брагіне мы не змаглі ўбачыць на сцэне спектакль народных артыстаў. Аб іх майстэрстве можна было меркаваць толькі па тых жа дыпломах і граматах, па фатаграфіях ды па цёплых водгуках гледачоў. Але мы пацікавіліся, як дапамагаюць ім метадысты і прафесіяналы, што прыязджаюць сюды зрэдку. Шчыра кажучы, пачулі не зусім прыемныя рэчы. Адны з памочнікаў робяць сваю справу чыста фармальна—абы значылася, што былі. Другія ж глядзяць на іх паблажліва: маўляў, чаму вучыць гэтых правінцыялаў, хіба яны могуць зразумець, што такое сапраўднае мастацтва?! Зусім дарэмна. Людзі, з якімі нам давялося пазнаёміцца, любяць і разумеюць прыгожае і лепш, чым хто-небудзь іншы, ведаюць, наколькі іх праца патрэбна народу.

Мы адляталі з Брагіна. Пасажыраў было мала—тры бабулькі і дзяўчына. Бабулек хутка закалыхала. Разгаварыліся з маладзейшай. Яна з Брагіна, ляціць у Мінск здаваць сесію: вучыцца завочна ў народна-гаспадарчым інстытуце. На наша трафарэтнае: «Не сумна тут?» дзяўчына ўсміхнулася:

— Чаму гэта? Хаджу з сяброўкамі ў кіно, на вечары адпачынку, на танцы, у тэатр....

— Які тэатр?

— Наш, брагінскі, народны...

У голасе нашай спадарожніцы была нотка гонару.

М. ГІЛЕВІЧ.
Фота Ул. КРУКА.

— Пазнаеце? Так, гэта Клава і Лявон з «Лявоніхі на арбіце».

Сцэна са спектакля «Выбух».

Л. Каваленка праводзіць заняткі з удзельнікамі духавога аркестра.

З НАШАЙ ПОШТЫ

НІ ЖАДАННЯ, НІ ЎМЕЛЬСТВА

Новы прасторны сельмаг у Цішоўцы. На дзвюх невялічкіх паліцах стаіць дзесяткі тры кніг. Каля сотні экземпляраў іх ляжыць пад прылаўкам. Я прашу прадаўца паказаць мне навінкі мастацкай літаратуры. Ён здзіўлена глядзіць на мяне, а потым адказвае:

— Адкуль жа тыя навінкі будуць, калі вось паўтары гады ўжо, як нам літаратуры не прывозілі?

Прадавец Уладзімір Зорачкін доўга тасуе кніжкі пад прылаўкам і нарэшце падае нарыс Сяргея Грахоўскага «Горад маладосці».

— Вось і ўсё, — сказаў ён.

Быў я і ў іншых магазінах Казіміраўскага сельпо Магілёўскага раёна. І там тое ж самае. У сельмагу, што ў вёсцы Камінтэрн, напрыклад, ёсць толькі па адной кніжцы рамана Кузьмы Чорнага «Трэцяе пакаленне», Тараса Хадкевіча «Пачатак дружбы», Уладзіміра Нядзведскага «Вясновыя баразны», Алеся Бачылы «Яснае світанне», Алеся Махнача «Драматычныя мініяцюры». Вось, бадай, і ўсё.

У Казіміраўскім сельмагу ляжаць больш дзвюх тысяч экземпляраў кніг. Прывезены яны пяць-шэсць гадоў назад. Гэта ў большасці сваёй падручнікі для вучняў старэйшых класаў. А сярэдняй школы паблізу няма, таму іх ніхто і не купляе.

Многа ў магазінах старых кніг і брашур, якія ў бібліятэках даўно спісаны. У сельмагу вёскі Камінтэрн і сёння знойдзеш кнігі і брашуры па травапollю, альманах для дзяцей «Прыамур'е» за 1958 год, розныя пажоўклыя і пакрытыя пылам брашуры. Патрэбных жа кніг для працаўнікоў вёскі — тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, новых выданняў рускіх і беларускіх пісьменнікаў няма.

Вінаваты, вядома, самі гандлёвыя работнікі. Глядзяць яны на кнігі, як на «нехадавы тавар». Не вывучаюць попыту пакупнікоў, не маюць цеснай сувязі з бібліятэчнымі работнікамі, настаўнікамі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі. А таму і не ведаюць, што патрэбна працаўнікам калгасаў і саўгасаў, не ведаюць, на якую літаратуру падаваць заяўкі. Ды іх і не патрабуюць у райспажыўсаюзе.

Не знайшоўшы ў сельмагу патрэбнай літаратуры, пакупнікі едуць у Магілёў. А вось для бібліятэкі Магілёўскага раённага аддзялення «Сельгастэхніка» летась каля 400 экземпляраў кніг прывёз суседні Бялыніцкі райспажыўсаюз.

Сёлета ў аддзяленні «Сельгастэхніка» таксама выдзелена 400 рублёў на набыццё для бібліятэкі новай літаратуры. Але ў Казіміраўскім сельмагу яе пакуль што няма. Магчыма, зноў давядзецца звярнуцца да паслуг сваіх суседзяў.

Аб непаваротлівасці гандлёвых работнікаў Казіміраўскага сельпо сведчыць яшчэ адзін факт. Летась Цішоўскі сельмаг перавёў сельпо на новую літаратуру для бібліятэк 150 рублёў. Бібліятэкары паехалі на базу, падабралі патрэбную літаратуру. Дык яе толькі праз паўгода даставілі з базы райспажыўсаюза ў Цішоўку.

Казіміраўскае сельпо штогод не выконвае планы продажу кніг. Летась, напрыклад, трэба было рэалізаваць літаратуры на 6.305 рублёў, план жа быў выкананы толькі на 24,4 працэнта. Становішча не палепшылася і сёлета. За два з палавінаю месяцы гэтага года магазіны сельпо прадалі літаратуры на... 17 рублёў.

Без жадання і ўмельства гандлююць кнігай у Казіміраўскім сельпо.

М. НАЗАРОВІЧ.

КЛОПАТЫ ЧЫТАЧА

Есць у горадзе Косаве светлы, прасторны будынак кнігарні. Тут добра афармлены стэнды з палітычнай, мастацкай і навукова-тэхнічнай літаратурай, а таксама з сельскагаспадарчымі выданнямі, вітрыны з наборам паштовак, кніг па мастацтву, рэпрадукцый карцін мастакоў. Здаецца, многа кніг — добрых і розных.

І ўсё ж знайсці тут патрэбную кнігу можна далёка не заўсёды.

— Цяжка працаваць, — гаворыць прадаўшчыца Ліда Краўцэвіч. — Не, не таму нават, што ўсю зіму ў магазіне стаяў мароз: ніяк не маглі адрамантаваць трубы ацяплення. Самае горшае тое, што вельмі часта мы не можам даць пакупніку таго, што ён патрабуе. Кніжкі мы атрымоўваем на раённай базе. Даюць нам тое, што там ёсць. А іншы раз бывае так: выйшаў новы раман у двух частках, дык спачатку нам прывязуць другі том, а праз нейкі час—першы. Многія ж кнігі да нас і зусім не даходзяць. Напрыклад: просіць пакупнік кнігу, якую нядаўна вылалі, а я нават і не чула пра яе. І не таму, што не цікаўлюся, а таму, што ні бюлетэняў, ні каталогаў мы не маем. Проста не ведаеш, што адказаць чалавеку. Або ўзяць падпісныя выданні. Мы таксама не ведаем, на якія кнігі будзе ў гэтым годзе падпіска. А нашы ж пакупнікі цікавяцца многім...

Сапраўды, дзяўчыне можна толькі паспачуваць. Няўжо ж нельга выправіць такое становішча?

Гэта — адно. Другое, што нас хвалюе, — папаўненне кніжных фондаў бібліятэк. Калі бачыш на бібліятэчнай паліцы кніжку, пакрытую пылам, некранутую некалькі гадоў, становіцца сумна. Яна — непатрэбны тут баласт. На жаль, такіх кніг у раённых і сельскіх бібліятэках яшчэ вельмі многа. Чаму?

Адказ, здаецца нам, толькі адзін. Сродкі на набыццё кніг бібліятэкам выдаюць ад выпадку да выпадку, часцей — у канцы года. У выніку бібліятэкары вымушаны купляць тое, што ёсць у гэты час у кнігарні. Вядома, што разам з цікавымі, патрэбнымі творамі на паліцы бібліятэк трапляе і той баласт, пра які мы гаварылі. На першы погляд, справа зроблена: грошы выдаткаваны, кніжны фонд павялічаны. А вось якія кнігі набыты, гэта нікога не цікавіць.

А чаму б не адпускаць бібліятэкам сродкі на працягу ўсяго года? Калі ў кнігарні ёсць новыя, цікавыя кнігі — набывай! Думаецца, што гэта таксама можна зрабіць.

Р. БАКІЕВІЧ.

Ратныя і працоўныя подзвігі нашых людзей — асноўная тэма творчасці маладога магілёўскага скульптара Станіслава Дамарацкага. Ім выкананы скульптуры юнай падпольшчыцы Тані Карпінскай, падрыўніка Кавалёва, бюсты генералаў Раманава і Гусакоўскага, прадзільшчыцы Героя Сацыялістычнай Працы Белавусавай і іншых.

Цяпер С. Дамарацкі працуе над стварэннем вобраза легендарнага артылерыста Мікалая Сірацініна.

Фота **П. ЖАЛУДОВІЧА** (БЕЛТА).

У ВЫКАНАННІ СТРУННАГА КВАРТЭТА

Чацвёра маладых музыкантаў — Валерый Сарока, Павел Валадарскі, Лючыя Ластаўка і Мікалай Шчарбакоў — складаюць струнны квартэт Саюза кампазітараў Беларусі. Арганізаваны ўсяго некалькі месяцаў назад, гэты інструментальны ансамбль паспеў не толькі падрыхтаваць адпаведны рэпертуар з твораў савецкіх, у тым ліку беларускіх кампазітараў, але і выступіць з канцэртамі ў некаторых універсітэтах культуры, па мінскім тэлебачанні, у зборным цэху і цэху нармалей аўтамабільнага завода, перад навучэнцамі Маладзечанскага музычнага вучылішча.

Гэтымі днямі струнны квартэт даў другі камерны канцэрт у зале Саюза кампазітараў. Выконваючы розныя па змесце і настрою творы, маладыя музыканты імкнуліся перадаць характэрныя рысы стылю таго ці іншага кампазітара, пранікнуць у яго мастацкую задуму.

Уключаны ў праграму квартэт №2 беларускага кампазітара П. Падкавырава прысвечаны памяці тых, хто не вярнуўся з поля бою ў дні Вялікай Айчыннай вайны. Кампазітар пісаў свой інструментальны твор у цяжкія ваенныя гады і закончыў яго ўжо ў вызваленым Мінску.

Першая частка квартэта прагучала ў канцэрце, як патэтычная, сумная песня аб загінуўшых героях, насычаная вялікім і ўсхваляваным чалавечым пачуццём. Гэтая частка канчаецца незвычайна: апошні акорд нібы павісае ў паветры, не знаходзячы апоры, не завяршаючы думкі кампазітара.

Скерца — другая частка квартэта. Імклівы, рашучы рух, напружаны драматызм — гэтыя павароты ў вобразна-музычным змесце скерца ўдзельнікі квартэта стараліся перадаць з вялікім тактам, з унутраным мастацкім напаўненнем. Без перапынку скерца пераходзіць у лахавальны марш. Але тут няма горычы і роспачы — гэта смутак мужнага сэрца, якое ўмее пакутаваць, марыць аб светлым і цудоўным, быць суровым і непахісным. Іменна так ігралі нашы музыканты гэтую частку квартэта. Увогуле квартэт П. Падкавырава быў выкананы з уздымам.

У гэты ж вечар цікава прагучаў выдатны твор камерна-інструментальнай літаратуры — Другі квартэт С. Пракоф'ева, у якім кампазітар выдатна выкарыстоўвае інтанацыі закаўказскіх народных мелодый. Успрыняццю пракоф'еўскага квартэта з яго паэтычнымі музычнымі вобразамі значна садзейнічала пранікнёнае, шчырае выкананне артыстаў.

Апрача двух квартэтаў, маладыя выканаўцы выканалі некалькі невялікіх інструментальных п'ес, сярод іх — Скерца і Элегію М. Шнейдэрмана. Скерца — добрая мініяцюра, толькі вельмі ўжо кароткая. Не паспееш працяцца настроем народнай весялосці, як музыка ўжо канчаецца. Затое Элегія, наадварот, выглядае празмерна расцягнутай і сумнаватай. З-за гэтага яна зрабіла на слухачоў меншае ўражанне, чым Скерца.

Чатыры армянскія народныя песні Камітаса ў апрацоўцы для квартэта С. Асламазяна завяршалі праграму. «Вясна», «Курапатачка», «Песня касца» і «Святочная» — чароўныя п'есы, і артысты сыгралі іх, бадай, лепш за папярэднія нумары. Выканаўцы злілі галасы сваіх інструментаў у адухоўлены, адзіны, стройны ансамбль.

Падводзячы вынікі гэтага камернага канцэрта, можна было б указаць на тое, што іншы раз у ігры ўдзельнікаў квартэта не хапала зладжанасці, сёй-той з іх вельмі настойліва вылучаўся з гэтага невялікага калектыву, пагарджаючы сваімі таварышамі. У асобных нумарах адчувалася інтанацыйная недакладнасць, адсутнасць чысціні ладу. Але гэта выдаткі творчага росту, станаўлення ўдзельнікаў маладога калектыву, і яны паступова будуць знікаць, саступаючы месца сапраўднаму прафесіяналізму.

А. РАКАВА.

КЛІЧУЦЬ ДАРОГІ

— Пойдзем паглядзім наша фільмасховішча, — з нейкім гонарам сказаў Андрэй Васільевіч Мыльнікаў, мастацкі кіраўнік грамадскай кінастудыі Беларускай чыгункі.

Вось масіўныя дзверы. Запальваецца святло. Уздоўж сцен — паліцы, застаўленыя металічнымі каробкамі. Фільмы захоўваюцца ашчадна. Да іх зроблены падрабязныя анатацыі.

Фільмасховішча — гэта своеасаблівы баланс работы грамадскай кінастудыі. Яна існуе крыху больш трох гадоў. Вось стужкі, зробленыя яшчэ ў 1959 годзе, калі ўпершыню апараты ўключылі юпітэры...

Шмат непаладкаў было, калі дакументалісты здымалі свой першы нарыс. Тады ўзнікла думка зняць фільм пра невялікую станцыю Беларускай чыгункі. Пачынаючым кінадакументалістам падказалі сюжэт больш лёгкі — пра работу Дома тэхнікі. Тут людзі вучацца перадавому вопыту, тут вялікі грамадскі актыў. Сцэнарый атрымаўся цікавы. На думку многіх гледачоў, дакументалісты здолелі вытрымаць першы экзамен.

За першым фільмам быў зняты другі. Вось стужкі нарыса «Капрон замест металу», падказанага аператарам самім жыццём. На Усесаюзным фестывалі аматарскіх кінафільмаў чыгуначнікаў ён быў удастоены дыплома другой ступені. Добрую ацэнку атрымаў і на рэспубліканскім аглядзе. Нарыс цяпер паказваюць на вялікім экране.

Можна назваць і іншыя фільмы, якія атрымалі прызнанне гледачоў. Гэта кінастужкі «За тэхнічны прагрэс», «Разведчыкі будучыні». Пра вопыт укаранення паўаўтаматычнай блакіроўкі з палярным лінейным ланцугом расказана ў кінанарысе «Новая сістэма». Але гэта—усё ў мінулым. Чым жа заняты кінадакументалісты Беларускай чыгункі сёння?

Сёлета намячаецца зняць тры кінанарысы. Здымачныя работы пачаліся ўжо. Нядаўна з камандзіроўкі вярнуўся аператар Эрнест Мыльнікаў. Разам са сваімі памочнікамі ён ездзіў у праслаўленае на чыгунцы Аршанскае дэпо імя К. С. Заслонава.

«Заслонаўцы сёння» — так называецца новы фільм. Аператарам удалося зняць перадавых людзей дэпо, якія ў мірнай працы з гонарам наследуюць традыцыі незабыўных герояў часоў Айчыннай вайны. Кінанарыс глядзіцца з цікавасцю.

Студыйцы працуюць яшчэ над двума фільмамі. Адзін з іх прысвечаны электрыфікацыі чыгункі. Яшчэ ўчора па сталёвых лініях імчаліся паравозы. Ды вось паравознаму веку надыходзіць канец. У недалёкай будучыні хутка паймчаць па магістралях электрацягнікі. Пра тых, хто змагаецца за тэхнічны прагрэс, і расказвае нарыс.

А што вы ведаеце пра бясстыкавую пракладку пуцей, прапанаваную ўпершыню ў нашай краіне беларускімі чыгуначнікамі? Аўтарам гэтага выдатнага метаду з'яўляецца галоўны інжынер службы пуці Павел Знаменскі. Пра гэта таксама стараюцца расказаць нашы грамадскія кінадакументалісты. Такі кінанарыс з цікавасцю чакаюць і на іншых чыгунках. Фільм будзе дэманстравацца ў павільёне чыгуначнага транспарту на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі.

...Добра ідзе праца на грамадскай кінастудыі. Гэта невялікі, але згуртаваны творчы калектыў. У цітрах кінафільмаў мы звычайна чытаем прозвішчы аператараў, аўтараў сцэнарыя, тых, хто стварыў музыку. У грамадскіх кінадакументалістаў вельмі шмат памочнікаў. Пра іх таксама хочацца ўспомніць. Гэта — старшыня мастацкага савета кінастудыі галоўны інжынер чыгункі Мікалай Несцярэнка, інжынеры-кансультанты, якім многім абавязаны стваральнікі фільмаў,— Валянцін Созінаў, Анастасся Бальцэвіч, Рыгор Гуціт. Ды ўсіх памочнікаў, шчыра кажучы, і не пералічыць.

М. ЯФІМАЎ.

КУДЫСЬЦІ НЕ ТУДЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

вершаў і паэм, якія аздабляюць старонкі трохтомнай Анталогіі беларускай паэзіі, увайшлі ў яе скарбніцу. Шчыра кажучы, я не бачу, каб у нашых маладых паэтаў ды і празаікаў меліся б, адпаведна па ўзросту, такія плённыя здабыткі.

Больш павагі да працы сваіх старэйшых сяброў. Літаратура — не могілкі з пышнымі помнікамі, дзе для таго, каб знайсці месца для свайго манумента ці манументіка, трэба скінуць помнік папярэдніку, літаратура — гэта наша жывая народная і партыйная справа, і ўсім хопіць у ёй месца для працы, абы толькі было ўменне і шчырае жаданне. Больш павагі і любві да спадчыны нашых класікаў! І няхай зусім знікнуць фанабэрыстасць і прэтэнцыёзнае невуцтва.

У заключэнне я хачу спыніцца яшчэ на адным, на маю думку, важным пытанні. У ходзе дыскусіі не раз узнікала размова аб мастацкай праўдзе. І тут я ніяк не магу пагадзіцца са сцвярджэннем некаторых таварышаў, якія гаварылі аб гэтай праўдзе, як аб нейкай абстрактнай гуманістычнай катэгорыі з нейкіх агульначалавечых пазіцый, забываючы аб непарушным прынцыпе партыйнасці нашай літаратуры, які мае самае непасрэднае дачыненне і да паняцця мастацкай праўды. Васіль Быкаў у сваім артыкуле «Праблема старая і—новая» спрабуе нават абгрунтаваць гэта няправільнае сцвярджэнне аб нейкай агульначалавечай пазакласавай праўдзе:

«Думаецца, не зусім справядліва некалі класік нашай літаратуры падзяліў праўду на некалькі розных праўд, якія дастасоўваліся да патрэб розных класаў. Можа быць, той падзел і правамерны быў для мінулага, але ён зусім беспадстаўны для нашага сёння». Дык няўжо ж адна праўда і ў шахцёра Салігорска, і ў непапраўнага піжона-дармаеда, і ў пана Ракфелера?! Мне неяк няёмка гаварыць аб гэтай відавочнай і неабвержнай ісціне з таленавітым празаікам Васілём Быкавым, творчасць якога якраз і служыць яркім доказам таму, што разуменне праўды можа быць толькі разуменнем класавым, партыйным.

Валянцін Тарас нават свой артыкул назваў «Вечны агонь праўды». Але разуменне праўды ў В. Тараса таксама аднабаковае. Праўда для яго перш за ўсё сродак барацьбы з перажыткамі часоў культу асобы. І пасля прачытання «Вечнага агню праўды» астаецца ўражанне, што Тарас першачарговай і асноўнай задачай пісьменніка сёння лічыць барацьбу з перажыткамі часоў культу асобы, бачачы ў тым перыядзе жыцця нашага народа перш за ўсё адмоўнае. Я глыбока перакананы, што кожны сапраўдны пісьменнік, пішучы пра часы, звязаныя з культам асобы, нягледзячы на ўсё тое цяжкое і змрочнае, што нам давялося тады перажыць, перш за ўсё будзе гаварыць аб вялікім подзвігу народа і партыі, якія стварылі магутную сацыялістычную дзяржаву, аб працоўнай рамантыцы нашых першых пяцігодак і героях-будаўніках, аб гістарычных перамогах у часы Вялікай Айчыннай вайны.

Нядаўна я прачытаў інтэрв'ю, дадзенае «Літературной газете» адным з буйнейшых музыкантаў сучаснасці Ігарам Маркевічам, які нарадзіўся ў 1912 г. ў Кіеве, а праз год выехаў з сям'ёй за граніцу і толькі ў 1960 годзе першы раз наведаў радзіму. Вось што гаворыць Ігар Маркевіч, які пражыў усё жыццё ўдалечыні ад Айчыны і не вучыўся ні ў савецкай школе, ні ў савецкім універсітэце:

«Хацелася б таксама закрануць і пытанні, звязаныя з ліквідацыяй вынікаў культу асобы Сталіна ў вашай краіне. Бываючы ў буржуазных краінах, савецкія людзі ахвотна адказваюць на пытанні, звязаныя з культам асобы. І ўсё ж я думаю, што ў любым выпадку трэба, каб ніколі не забывалася чвэрць стагоддзя, на працягу якой савецкі народ зрабіў такі вялізны крок наперад, які ніколі не рабіла якая-небудзь іншая краіна».

Аднабаковыя сцвярджэнні, пра якія тут ішла гаворка, на маю думку, — вынікі недастатковай ідэйнай загартоўкі маладых аўтараў.

Нам трэба выхоўваць нашу літаратурную моладзь без сюсюкання і заігрывання з ёю, а ўдумліва, пабацькоўску, як гэта рабіў Максім Горкі, не замазваючы промахаў таго ці іншага маладога літаратара і разам з тым без бэндаўскай нашатыркі і дубінкі. Нам трэба глыбей вывучаць і разумець тыя вялікія асновы, я маю на ўвазе партыйнасць і народнасць, на якіх грунтавалася, грунтуецца і будзе грунтавацца наша савецкая літаратура.

ПЕРШЫ СПЕКТАКЛЬ МАЛАДОЙ СТУДЫІ

Летась у Магілёве пры аб'яднаным Доме культуры швейнай фабрыкі, завода «Электрарухавік» і абутковай фабрыкі была створана тэатральная студыя. Назвалі яе тэатрам-студыяй «Дружба».

Чаму была дадзена такая назва? У студыю прыйшлі аматары тэатральнага мастацтва з розных прадпрыемстваў і ўстаноў горада. Студыйцаў таксама звязвае моцная творчая дружба з артыстамі Магілёўскага абласнога тэатра. У ліку выкладчыкаў студыі — артысты тэатра Н. Фядзяева і М. Бярозкін. Яны знаёмяць студыйцаў з гісторыяй тэатра, з асновамі сцэнічнага мастацтва, дзеляцца з імі сваім творчым вопытам. Жывы ўдзел у дзейнасці студыі прымаюць і іншыя артысты прафесіянальнага тэатра.

Прайшоў першы перыяд напружанай вучобы. Вынікам яго з'явіўся камедыйны спектакль па п'есе «Чамадан з наклейкамі» Д. Угрумава. Паставіў спектакль мастацкі кіраўнік тэатра-студыі Ул. Бараноўскі. Дэкарацыі мастака А. Белазёрава. Побач са студыйцамі В. Арцюховай, Г. Волкавым, А. Кубліцкай, П. Цішноўскім, В. Яноўскай і іншымі ў спектаклі ўдзельнічаюць артысты Абласнога драматычнага тэатра народны артыст РСФСР М. Радзіёнаў, заслужаная артыстка КАССР Н. Фядзяева, артыст М. Бярозкін.

Спектакль, прэм'ера якога адбылася ў памяшканні абласнога тэатра, быў цёпла прыняты гледачамі.

ЗА МЯЖУ

Беларуская кніга карыстаецца вялікім попытам за мяжой. Яе атрымліваюць Англія, Францыя, Канада, ЗША, Аўстрыя, ФРГ, Польшча і іншыя краіны свету. Многія замежныя краіны заказалі новае выданне збораў твораў Я. Купалы і Я. Коласа. Англія, напрыклад, ужо атрымала па 25 экземпляраў асобных тамоў гэтых выданняў. Толькі за мінулыя два месяцы рэспубліканская кніжная база выканала замежныя заказы на кнігі «Незабыўнае» З. Азгура, «Беларускі раман» А. Адамовіча, «Вязьмо» М. Зарэцкага, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Іду ў жыццё» Р. Сабаленкі, «Шчасце маё» М. Пянкрата, а таксама на навуковыя зборнікі і працы па беларускай літаратуры, мовазнаўству, кіно, мастацтву. У гэтым годзе ўжо выслана ў адрас замежных фірм кніг на суму звыш дзесяці тысяч рублёў.

Нядаўна з ЗША атрыман новы заказ на зборы твораў Я. Брыля і М. Клімковіча, кнігу «Ля пераправы» М. Лупсякова, зборнік «Людзі Прыдняпроўя», «Старонкі братняй дружбы» С. Александровіча і іншыя беларускія выданні.

З розных шырот

«ГЛЕДАЧАМ ЗАСТАЕЦЦА ТОЛЬКІ ЗАХАПЛЯЦЦА»

У Брусэлі з трыумфам закончыліся гастролі Маскоўскага дзяржаўнага цырка.

Больш месяца савецкія артысты дэманстравалі сваё мастацтва ў Каралеўскім цырку бельгійскай сталіцы перад патрабавальнымі гледачамі. За час гастролей Маскоўскага дзяржаўнага цырка ў Брусэлі яго паказы наведала каля 100 тысяч чалавек, практычна кожны дванаццаты жыхар бельгійскай сталіцы. Калектыву Маскоўскага дзяржаўнага цырка быў уручаны памятны медаль горада Брусэля. Да гэтага яшчэ ніводзін цыркавы калектыў не быў удастоены такога гонару. Журы Каралеўскага цырка прысудзіла прыз «Оскар 1963 года» савецкім канатаходцам Валжанскім. «Оскар» — гэта ганаровы прыз, устаноўлены бельгійскім Каралеўскім цыркам для ўзнагароджання выканаўцаў лепшых цыркавых нумароў сезона.

Выступленні майстроў савецкага цырка ў Брусэлі праходзілі з вялікім поспехам. Ні разу не было выпадку, каб у глядзельнай зале пуставалі месцы. Высокае выканаўчае майстэрства, арыгінальнасць нумароў, багацце цікавых творчых знаходак савецкіх артыстаў цырка і вельмі добрая зладжанасць усяго калектыву захапілі бельгійскіх гледачоў.

Усе бельгійскія газеты змясцілі захапляючыя водгукі аб трыумфе Маскоўскага дзяржаўнага цырка ў Брусэлі.

«Новая праграма Маскоўскага цырка, — пісала газета «Драпо руж», — літаральна азадачвае гледачоў: дзе мяжа чалавечых магчымасцей?» «Выключна! Неверагодна! Нябачана! — гэта першае, што прыходзіць у галаву прысутным на асляпляльным чаргаванні новых нумароў, падрыхтаваных Маскоўскім цыркам да свайго трэцяга прыезду да нас», — пісала газета «Дэрньер ор». Адзначаючы высокую тэхніку выканання ўсіх без выключэння нумароў, газета «Пепль» пісала: «Тут усё разлічана, размерана і прадумана. Гледачам застаецца толькі захапляцца».

Часам газеты аддаюць асаблівую перавагу некаторым нумарам. «Сітэ» і «Пепль» у захапленні ад туркменскіх джыгітаў. «Лібр Бельжык» высока ацэньвае майстэрства канатаходцаў Валжанскіх і паветраных гімнастаў Хазавых. «Суар» вылучае жанглёра на кані Альхавікова. Ні адна газета не забываецца асобна ўспомніць пра «львоў-наезнікаў» мужа і жонкі Буслаевых. І ўсе без выключэння газеты вымушаны прызнаць, што ўсе нумары новай праграмы Маскоўскага дзяржаўнага цырка па сутнасці справы настолькі цудоўныя і своеасаблівыя, што цяжка аддаць перавагу якому-небудзь аднаму нумару.

У апошні тыдзень гастролей Маскоўскага дзяржаўнага цырка ў Брусэлі былі арганізаваны дадатковыя ранішнія паказы. Таварыства бельгійска-савецкай дружбы наладзіла прыём у гонар савецкіх артыстаў, які выліўся ў сапраўднае свята дружбы паміж савецкім і бельгійскім народамі.

Гастролі Маскоўскага дзяржаўнага цырка ў Брусэлі па праву лічацца вялікай падзеяй у культурным жыцці бельгійскай сталіцы.

Э. ГЕШАНЕК — КАМУНІСТ, АКЦЁР

Хто не памятае захапляючых кадраў тэлевізійнага фільма-эпапеі «Сумленне абуджаецца», створанага на кінастудыі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі «ДЭФА»! Гэты твор неаднаразова дэманстраваўся па Цэнтральным тэлебачанні СССР. Без хвалявання нельга сачыць, як палкоўнік Эберсхаген, афіцэр гітлераўскага вермахта, пачынае ўсведамляць усю бессэнсоўнасць, усю жорсткасць вайны, развязанай гітлераўскай Германіяй супраць Савецкага Саюза, як ён прымае гуманнае і разам з тым адзіна правільнае рашэнне здаць наступаючай Савецкай Арміі без бою горад Грэйфсвальд, камендантам якога ён быў. Запамінальны вобраз палкоўніка Эберсхагена стварыў Эрвін Гешанек, адзін з выдатных акцёраў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Нялёгка склалася жыццё Гешанека. Яму, сыну простага шаўца, не даводзілася і думаць пра вучобу. У капіталістычнай Германіі ён працаваў рассыльным пры адным з банкаў, потым рабочым у магазіне. Шмат гадоў быў падсобным рабочым на будаўніцтве. Гэтыя гады сталі вялікай школай жыцця для Эрвіна. Ён выбірае шлях, па якім цвёрда ідзе ўсе наступныя гады: у 1929 годзе ён уступае ў Камуністычную партыю Германіі. У тым жа годзе маладому рабочаму ўпершыню ўдаецца выступіць на сцэнічных падмостках. Рэвалюцыйная арганізацыя рабочых «Ротэ хільфе» наладзіла ў адной з берлінскіх залаў выступленні сваёй агітацыйнай групы. У невялікай трупе артыстаў, што выступалі перад рабочымі, быў і Эрвін Гешанек. Хутка ён паспрабаваў свае сілы ў тэатры імя Шылера. Гэта былі першыя крокі Эрвіна-акцёра. Відаць, у гэты час і зарадзілася ў яго мара стаць сапраўдным акцёрам, прысвяціць сваё жыццё сцэнічнаму мастацтву. Але не ўдалося маладому рабочаму ажыццявіць у гэтыя гады сваю мару. Гэта быў час напружанай барацьбы нямецкіх камуністаў за мір, супраць наступлення фашызму. Удзельнікам гэтай барацьбы стаў і Эрвін Гешанек.

1932 год. У перыяд перадвыбарчай кампаніі Эрвін Гешанек вядзе агітацыю за кандыдата рабочых Эрнста Тэльмана. У 1933 годзе Гешанека шукаюць штурмавікі як «небяспечнага чырвонага агітатара». У жніўні 1933 года малады рабочы вымушаны эміграваць. У 1938 годзе ён кіруе ў Празе эмігранцкай самадзейнай групай і сам іграе ў п'есах Брэхта. Пасля нападу фашыстаў на Чэхаславакію Гешанек трапляе ў лапы гестапа. Пачаліся доўгія гады канцэнтрацыйных лагераў, катаванняў, здзекаў. Заксенхаузен, Дахау, Нейенгаме — такія этапы гэтага шляху. Але верны сын свайго класа вытрымаў і гэты цяжкі экзамен.

Пасля краху гітлераўскай дыктатуры выпрабаваны антыфашыст зноў у першых радах барацьбы за інтарэсы нямецкіх працоўных.

Але вось створана Германская Дэмакратычная Рэспубліка — першая ў гісторыі Германіі дзяржава рабочых і сялян. І Эрвін Гешанек спяшаецца ў Берлін. Яго першай роллю ў пасляваенным Берліне была роля Мацці ў п'есе Брэхта «Пан Пунціла і яго слуга Мацці». Выкананне гэтай ролі вылучыла Гешанека ў лік вядучых акцёраў маладой рэспублікі.

У апошні час акцёр плённа працуе ў кіно.

Усё сваё жыццё і творчасць Эрвін Гешанек прысвячае сваёй рэспубліцы, свайму народу. І ён карыстаецца заслужаным прызнаннем. Эрвін Гешанек — тройчы лаўрэат Нацыянальнай прэміі. Партыйная арганізацыя Берліна аказала яму вялікі гонар: Эрвін Гешанек быў выбраны дэлегатам VI з'езда Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі.

БАЛГАРСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1963 ГОДА

Сёлета балгарскія выдавецтвы выпускаюць у свет звыш 3.500 кніг агульным тыражом у 36 мільёнаў экземпляраў. Побач з грамадска-палітычнай і спецыяльнай літаратурай будзе выдадзена вялікая колькасць мастацкіх твораў балгарскіх пісьменнікаў. Гэта раманы Андрэя Гуляшкі «Калі віно кіпіць», «Быстрыні» Еміла Манава, «Завод паблізу вёскі» Ст. Ц. Даскалава.

Выдавецтва «Балгарскі пісьменнік» выпусціць рад твораў, прысвечаных сацыялістычнаму будаўніцтву ў Балгарыі: зборнік апавяданняў Паўла Вежынава «Хлопчык са скрыпкай», аповесць Серафіма Северняка «Зялёнае неба», раманы Дзімітра Гулева «Чалавечыя імёны» і Нядзелча Драганава «Гэта здарылася на вуліцы», другая частка кнігі Пятра Славінскага «Пераўтвораная зямля». Упершыню ў краіне выйдзе зборнік «Лепшыя апавяданні 1961—1962 г.г.».

Побач з выданнямі вершаў Боцева, Яварава, Смірненскага і Дэбелянава будуць выпушчаны ў свет зборнікі вершаў Младэна Ісаева, Добры Зоцева, Доры Габе, Георгія Джагарава, а таксама «Выбраныя вершы» Мікалая Фурнаджыева, Міколы Ланкова, Мікалая Стайкова, Ангеле Тодарава і іншых.

Для дзяцей і юнацтва будзе выдадзена 215 кніг агульным тыражом у сем мільёнаў экземпляраў.

ТЭАТР НЕЗАЛЕЖНАГА АЛЖЫРА

У маладой алжырскай дзяржаве пачаў дзейнічаць Нацыянальны тэатр. У цяжкія гады вайны за незалежнасць маленькая трупа артыстаў упрыгожвала суровыя будні алжырскіх патрыётаў, займаючы свае месца ў радах барацьбітоў за вызваленне і незалежнасць Алжыра.

Алжыр цяпер заняты стварэннем нацыянальнай дзяржавы і грамадства. Упершыню народныя масы атрымалі доступ да адукацыі, культуры, мастацтва.

Улічваючы важную ролю тэатра ў справе выхавання і асветы народа, алжырскі ўрад нядаўна нацыяналізаваў тэатр. Сёлета пяць драматычных тэатраў пачнуць працаваць у гарадах Алжыр, Аран, Канстанціна, Анаба (Бон) і Сідзі Бель Абес. Дырэкцыя нацыянальных тэатраў абвясціла нядаўна, што трупы гэтых тэатраў будуць выязджаць і ў іншыя гарады і вёскі Алжыра, паказваючы п'есы алжырскіх і замежных аўтараў. Намечана запрасіць таксама лепшыя тэатры іншых краін паказаць свае спектаклі на сцэне алжырскіх тэатраў. У першую чаргу ў Алжыры пабываюць тэатральныя трупы суседніх арабскіх краін.

У горадзе Арлеанвіль цяпер ствараецца Нацыянальны цэнтр драматычнага мастацтва, дзе будуць рыхтавацца рэжысёры і іншыя работнікі тэатра. У хуткім часе адкрыецца цэнтр па вывучэнню арабскага фальклору.

Адным з першых узнімае заслону Нацыянальны тэатр у горадзе Алжыры. «Мы адкрываем наш тэатр, нягледзячы на тэхнічныя цяжкасці і нястачу акцёраў», — заявіў кіраўнік тэатра Мустафа Катэб. Паводле паведамлення газеты «Альжэ Рэпюблікен», ён наступным чынам сфармуляваў творчыя прынцыпы алжырскага Нацыянальнага тэатра: «Наш тэатр будзе стаяць на пазіцыях рэвалюцыйнага рэалізму, які выкрывае дэкадэнцтва і памагае будаваць будучыню. Наш тэатр будзе прыхільнікам праўды ў самым глыбокім значэнні гэтага слова. Задача нашага тэатра — зачыніць дзверы для камерцыі ў драматычным мастацтве, узняць тэатр вышэй за чыста пацяшальных мэт. Мы закліканы служыць народу, зыходзіць з яго патрэб і спадзяванняў».

ПЕРАД КАНГРЭСАМ ЕЎРАПЕЙСКАГА ТАВАРЫСТВА ПІСЬМЕННІКАЎ

У Варшаве 15—20 мая бягучага года адбудзецца кангрэс Таварыства еўрапейскіх пісьменнікаў. У ім прымуць удзел каля 150 пісьменнікаў— прадстаўнікоў гэтага таварыства з 25 краін. Запрошаны ў Варшаву таксама 50 вядомых пісьменнікаў, якія не ўваходзяць у таварыства. Усе госці прымуць удзел у майскім кніжным кірмашы і выступяць на літаратурных вечарах. Асноўнай тэмай работы кангрэса будзе «Еўрапейская літаратура пасля 1945 года і свядомасць сучаснага чалавека». Гэтую тэму распрацоўваюць чатыры дакладчыкі — прадстаўнікі Савецкага Саюза, Польшчы, Англіі і Францыі.

ІМЯ Х. К. АНДЭРСЕНА

Дацкае выдавецтва «Ньют Нордзіск Форлаг» абвясціла аб пачатку чарговага конкурсу імя Ханса Крысціяна Андэрсена на лепшы раман. Па ўмовах конкурсу ў ім могуць прыняць удзел толькі маладыя пісьменнікі (не старэйшыя за 35 гадоў).

Газета «Палітыкен» паведамляе, што ў наступны дзень нараджэння вялікага дацкага казачніка — 2 красавіка 1964 года пераможцу конкурсу будзе ўручаны медаль памяці Х. К. Андэрсена і прэмія ў 5 000 крон.

ТАСС.



Шмат гадоў працуе Ганна Аляксееўна Баршай прадаўцом у аддзеле мастацкай керамікі салон-магазіна Беларускага аддзялення Мастацкага фонду СССР.

З кожным днём расце попыт на вырабы мастацкай керамікі, якія ўпрыгожваюць нашы кватэры.

На здымку: Ганна Аляксееўна Баршай прапаноўвае пакупнікам статуэтку.

Фота **В. МАРОЗА.**

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-24-61, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 10193